Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 198 (4103)
ПЯТНІЦА, 24 ЛІПЕНЯ
1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

ПЯТЫ ДЗЕНЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ І САМАПРАВЕРКІ

МТС, пакажэце ўзор барацьбы за сацыялістычны ўраджай

Камсамол яшчэ не павярнуўся тварам да падрыхтоўкі масавых кадраў сельскай гаспадаркі

СІЛАС—У КАРМАВЫ БАЛЯНС КОЖНАЙ ГАСПАДАРКІ

БЫХАЎСКІ, БРАГІНСКІ, БУДА-КАШАЛЕЎСКІ, ВЕТКАЎСКІ, ГЛУСКІ, ДУБРОВЕНСКІ, МАЗЫРСКІ, МЕНСКІ, ПЕТРЫКАЎСКІ І УВАРАВІЦКІ РАЁНЫ ЯШЧЭ НЕ ПАЧАЛІ СІЛАСАВАНЬНЯ

Калгасы „Шлях сацыялізму“ і „Новыя халаднікі“, камуна „Авангард“ і саўгас Стрэлічава на справе змагаюцца за кармавую базу

МЕНСК, 24 ліпеня

У БССР пачалася ўборка азімых. Спуцная МТС ужо выехала ў поле. Адна МТС за другой уключаюцца ва ўборку. Да поўнага яе разгортваньня як у раёнах дзейнасьці паўднёвых, так і паўночных МТС, засталіся лічаныя дні.

30 МТС Беларусі павінны ўбраць 77.397 га азімых. 220 тыс. яравых, ня лічачы падсеву траў і ўборкі шматгадовых траў пасеву мінулых гадоў на плошчы 21.718 га.

МТС шпарка разгортваючы ўборку азімых і яравых, павінны энэргічна рыхтавацца да далейшых этапаў, цесна зьвязанных з уборачнай кампаніяй (малацьба і загатоўка збожжа, сяўба азімых, зяблёва другі ўкос, сіпасаваньне і працы МТС ня скончылі. Уборачныя плянасова выканаць і перавыканаць свае праграмы, паказваючы ўзор сацыялістычных мэтадаў працы, на справе даводзячы перавагі калектыўнага гаспадараньня перад індывідуальным.

Факты гавораць аднак, што далёка ня ўсе МТС як належыць падрыхтаваліся да ўборкі ўраджаю і правядзеньня важнейшых палітычна-гаспадарчых кампаній, якія зьвязаны або супадаюць з уборачнай.

Яшчэ ня ўвесь трактарны парк і уборачныя машыны адрамантаваны і праверены. Работу па пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну і нападжваньні ўліку працы МТС ня скончылі. Уборачныя плян ны даведзены толькі да часткі калгасаў.

Да 20 ліпеня павінна была быць скончана сенаўборка. Між тым, плян сенаўборкі выканан толькі 3 МТС СТАРАДАРОСКАЙ, СМАЛЯВІЦКАЙ І МЕНСКАЙ. Астатнія МТС ганебна плятуцца ў хвасьце. СЕНЕНСКАЯ МТС, напрыклад, выканала толькі 17 проц. пляну, СІРОЦІНСКАЯ—18 проц., ДРЫСЕНСКАЯ—30 проц. Прэміяваная за веснавую сяўбу Танежыцкая МТС на здолела захаваць тэмпы—скасіла толькі 35,5 проц. сенажаці. КОЙДАНАЎСКАЯ МТС убрала 9 тыс. гэктараў надавыканаўшы свой плян на 1,000 га.

Нездавальняюча ідзе ПРАПОЛКА ІЛЬНУ. Досыць адзначыць, што ільнаводчыя ДРЫСЕНСКАЯ, ВЕТРЫНСКАЯ і АСЬВЕЙСКАЯ МТС выканалі плян праполкі ільну ад 7 да 10 проц.

МТС абавязаны сапраўды па-ўдарнаму ўзяцца за ліквідацыю гэтых, зусім нецярпімых прарываў. Скарыстоўваючы праверку і самаправерку, мабілізуючы масы калгасьнікаў і сваіх работнікаў, МТС павінны павесьці бальшавіцкую барацьбу за забясьпячэньне ВЫСОКІХ ТЭМПАЎ уборачнай і загатоўчай кампаніі. Практычна гэта азначае, што неабходна самым рашучым чынам узяцца за УКАРАНЕНЬНЕ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ І ПРАВІЛЬНАГА ЎЛІКУ ПРАЦЫ ва ўсіх без выключэньня калгасах. Ні аднаго калгасу, які-бы да пачатку масавай уборкі не працаваў на прынцыпах сапраўднай зьдзельшчыны, ня ведаўбы ад прыкладнай разьмеркаванай прыбытку—такі лозунг, які павінны па ставіць перад сабой МТС.

Правільна арганізуючы рабочую сілу ў калгасах, ліквідуючы абязьлічку, завяршаючы ажыцьцяўленьне арганізацыйна-вытворчых мерапрыемстваў да ўборкі, МТС павінны ва ўдарным парадку скончыць выкананьне пляну сенаўборачнай і праполачнай кампаніі. Самы рашучы адпор трэба даць кулаку, які імкнецца зацягнуць сенаўборачную, праваліць прапалачную. Да суровай адказнасьці апартуністаў, што сваёй бяздзейнасьцю і стаўкай на самацёк дапамогаюць клясаваму ворагу.

Рашаючым момантам у правядзеньні уборачнай зьяўляюцца пытаньні забясьпячэньня МТС і калгасаў КАДРАМІ масавых кваліфікацый. Асаблівае значэньне гэтыя пытаньні набываюць у сувязі са шпаркай мэханізацыяй сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Прыбываюць ільна-церабілні, складаныя малатарні, сіпасарэзкі, увосень арганізуюцца тры новых МТС, увесну 1932 г. № 7 новых МТС. Асноўны кантынгэнт масавых кадраў павінен складацца з калгасных мо-ладзі. Зусім зразумела, што перад КАМСАМОЛАМ, у сувязі з масавай падрыхтоўкай кадраў, стаіць вялізарная задача.

Трэба, аднак, адзначыць, што камсамольцы арганізацыі Беларусі яшчэ не павярнуліся тварам да будаўніцтва МТС і падрыхтоўкі неабходных кадраў. Ні адна з дырэктыў ЦК УсеЛКСМ па гэтым пытаньні ў БССР яшчэ не ажыцьцяўлена. Да гэтага часу ня прыступлена да ўмацаньня работнікамі камітэту ЛКСМБ у раёнах дзейнасьці МТС. У самым ЦК ЛКСМ ня вызначан спэцыяльны адказны інструктар па работе ў раёнах дзейнасьці МТС. Няма прадстаўніка камсамолу і ў беларускім аддзяленьні Трактарацэнтру. На ажыцьцяўленьне дырэктыва аб тым, што на курсах масавых кваліфікацый МТС павінны навучацца 60 проц. камсамольцаў. Ход падрыхтоўкі кадраў камсамолам ня правяраецца. Многія камсамольскія арганізацыі на аддаюць належнай увагі пытаньням разгортваньня сацыепаборніцтва і ўдарніцтва на МТС.

З недахопкай падрыхтоўкі кадраў трэба рашуча пакончыць. Камсамол павінен на ўвесь максімум увагі аддаць гэтай праблеме, па-ўдарнаму выконваючы свае абавязкі. Камсамол павінен даць патрэбным нам масавым кадры, забясьпечыць сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы камсамольцаў - работнікаў МТС, камсамольцаў-калгасьнікаў. Пад кіраўніцтвам партыі камсамол павінен на практыцы паказаць узор бальшавіцкай барацьбы за уборку сацыялістычнага ўраджаю.

Выступленьне т. Гея на сходзе партактыву Менскага чыгуначнага вузла

Узор адкрыты сход партактыву Менскага чыгуначнага вузла з дакладам аб выніках ліцьцьскага пленуму ЦК КП(б)Б выступіў сакратар Центральнага Камітэту партыі т. Гей. Пасьля дакладу рабочых з вялікім вытворчым стажам выказалі шкоды аб уступленьні у

КАЛГАС „ПРАЛЕТАРСКІ ШЛЯХ“

скончыў уборку азімых і раньніх яравых

БРАГІНА. Калгас «ПРАЛЕТАРСКІ ШЛЯХ», Глухавіцкага сельсавету, да веснавой сяўбы меў 18 гаспадарак. Праведзеная бальшавіцкімі тэмпамі сяўба дала магутны прыліў, зараз калгас налічвае 42 гаспадаркі.

Правільная арганізацыя працы на аснове зьдзельшчыны і шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва далі вельмі добрыя вынікі: 18 ЛІПЕНЯ КАЛГАС ПЕРШЫМ У РАЁНЕ СКОНЧЫЎ УБОРКУ АЗІМЫХ І РАНЬНІХ ЯРАВЫХ КУЛЬТУР, СКАСІЎ І УБРАЎ 70 ПРОЦ. УСЁЙ СЕНАЖАЦІ.

Ня спыняючы касьбы, калгас пераключыўся на абмалот збожжа і пачаў падрыхтоўку да асеньняй пасеўнай кампаніі.

ПРАЎЛЕНЬНЕ РАЙКАЛГАССАЮЗУ.

Раёны ўключаюцца ў месячнік генэральнай праверкі

ВОРША. (Па тэлегр.). Аршаншчына ўключылася ў месячнік генэральнай праверкі ўборкі і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы. Створан райштаб пад старшынствам сакратара РК КП(б)Б. Райкалгассаюз пасылае 10 рахункаводаў у калгасы па растлумачэньні разьмеркаваньня ўраджаю. Праведзена нарада старшынь сельсаветаў, сакратароў партячэек. У калгасах складаюцца самаправерачныя брыгады.

***

ПОЛАЦАК. (Па тэлегр.). Уключыліся ў месячнік самаправеркі. Паслана ў сельсаветы і калгасы 150 чал.

***

БАБРУЙСК. (Па тэлегр.). Бабруйшчына, уключыўшыся ў месячнік самаправеркі, абвясьціла яго месячнікам штурму прарываў у калектывізацыі і праверкі ўборачнай кампаніі. Створан райштаб, накіроўваюцца ўпаўнаважаныя па сельсаветах.

***

БЯЛЫНІЧЫ. (Па тэлегр.). Райштаб Бялыніцкага раёну прыступіў практычна праводзіць генэральную праверку ўборкі ўраджаю і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы. Накіравана 19 асоб партактыву ў вёску. У калгасах арганізуюцца самаправерачныя брыгады.

***

ЧЫРВОНАПОЛЬЛЕ. (Па тэлегр.). Раён уключыўся ў месячнік праверкі. Створан райштаб. 37 асоб партыйнага, камсамольскага, савецкага і прафэсыянальнага актыву накіраваны ў саўгасы і калгасы.

***

ЦЭРАХАЎКА. (Па тэлегр.). Раён уключыўся ў месячнік праверкі 22 ліпеня. У сельсаветы выдзелены па два адказных ўпаўнаважаных. Усяго выехала ў раён 40 чал.

***

ЛЮБАНЬ. (Па тэлегр.). Уключыліся ў месячнік праверкі ўборачнай і асеньняй сяўбы. 21 ліпеня арганізован штаб у складзе 11 асоб. У сельсаветы выяжджаюць прадстаўнікі. Зьвернута асаблівая ўвага на ход уборкі сена ў саўгасе Загальле.

***

КЛІЧАЎ. (Па тэл.). Выкуган райштаб. Брыгады мясцовых рабочых прыступілі да працы. У калгасах убрана 89 проц. сенажаці, у аднаасобным сэктары — 35 проц.

***

РЭЧЫЦА. (Па тэл.). Уключыліся ў месячнік праверкі ўборачнай і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы. Райштабам накіравана брыгада ў 35 асоб раённага партыйнага і прафэсыянальнага актыву. Арганізоўваецца конкурс на лепшае правядзеньне ўборачнай кампаніі і падрыхтоўку да асеньняй сяўбы. Пастанова Наркамзему і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні ўраджаю размножана ў колькасьці 5.000 экз. і рассылаецца па сельсаветах і калгасах. У бліжэйшыя дні праводзіцца куставы зьлёт селькораў, старшынь калгасаў і старшынь вытворчых нарад.

***

КЛІМАВІЧЫ. (Па тэлегр.). Клімаўскі раён уключыўся ў месячнік генэральнай самаправеркі. Створан райштаб з 7 асоб. У сельсаветы накірован райактыў у колькасьці 79 асоб. Складзены 2 агітпрапгрупы і 4 куставыя брыгады, якія 23 выехалі ў сельсавет.

***

СІРОЦІНА. (Па тэлегр.). Раён уключыўся ў месячнік праверкі разгортваньня ўборачнай і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы. Мабілізован раённы актыў у колькасьці 25 асоб і накіроўлены ў сельсаветы для практычнай дапамогі калгасам у параходзе на зьдзельшчыну і прапрацоўцы прыкладнай пастановы аб разьмеркаваньні ўраджаю.

***

КРУПКІ. (Па тэлеграфу). Уключыліся ў месячнік генэральнай праверкі ўборачнай кампаніі і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы. Арганізован райштаб. Мабілізавана 34 асобы райактыву і накіраваны ў сельсаветы.

***

ШКЛОЎ. (Па тэлеграфу). Для правядзеньня месячніка праверкі ўборачнай арганізован штаб. Сёньня накіроўваюцца ў вёску 54 асобы партыйнага і раённага актыву.

***

СМАЛЯВІЧЫ. Смалявіцкі раён з 20 ліпеня ўключыўся ў месячнік генэральнай праверкі разгортваньня ўборачнай і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы. Склад раённы штаб. У сельсаветы і калгасы накіраваны раённы партыйны і камсамольскі актыў. Прыступаем да арганізацыі пастоў раённай газэты «Шлях калектывізацыі» па калгасах і саўгасах.

„Чырвоны маяк“ пачаў уборку жыта

У прыгарадным саўгасе «Чырвоны маяк» (Менск) скончана ўборка сена і канюшыны.

23 ліпеня ўся рабочая сіла выйшла на ўборку жыта. На час уборкі жыта і яравых культур на агульным сходзе рабочыя саўгасу пастанавілі працаваць па 10 гадзін у дзень. Уся праца пераведзена на зьдзельшчыну. Высунуты сустрэчныя нормы зьдзельшчыны. Шырока разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва сярод рабочых. Саўгас уключыўся ў месячнік генэральнай праверкі, які праводзіцца «Зьвяздой», і ўзяў шэфства над калгасам «Адраджэньне», Палярнянскага сельсавету.

Саўгас выклікае на сац. спаборніцтва прыгарадны саўгас «Новы сьвет».

Харытончык.

ДРЫСА НЯ ПОЛЕ ІЛЬНУ

ДРЫСА. Па калгасах Дрысенскага раёну сёлета засеяна 1.987 гэктараў ільну. На сёньняшні дзень павінна ўжо было быць праполата ня менш паловы гэтай плошчы ільну. Між тым, поліва яшчэ фактычна не разгарнулася.

Райкалгассаюз ня даў належнага адпору агітацыі падкулачнікаў, якія гавораць: «Нашы дзяды не палолі і мы палоць ня будзем». Па калгасах плян праполкі ільну ня складзен, спэцыяльныя брыгады ня створаны.

Трэба рашуча ўдарыць па капкратных вінаватых у зрыве гэтай важнейшай кампаніі, па апартуністычнай недаацэнцы мерапрыемстваў, ад правядзеньня якіх залежыць павышэньне ўраджайнасьці ільну.

І. Сьвяржынскі.

Калгас „1 мая“ пачаў жніво

БАБРУЙСК. Калгас «1 мая» першым у раёне распачаў жніво. Уборка жыта ідзе на аснове зьдзельшчыны. Вызначаныя нормы выпрацоўкі калгасьнікамі перавыконваюцца.

Калгасы Вузьдзеншчыны—на дапамогу саўгасу Кухцічы

ВУЗДА. Саўгас Кухцічы моцна адстае з сенаўборкай. Яшчэ ня ўбрана 300 гэктараў сенажаці. Калгасы, якія ўжо скончылі сенаўборку і маюць лішак рабочай сілы, не арганізаваны на дапамогу саўгасу. Вузьдзенскі райкалгассаюз ня ўжыў нілкіх мер супроць праўленьняў тых калгасаў, якія ігнаруюць дырэктыву аб прадоўнай дапамозе саўгасу.

Уся сенажаць саўгасу павінна быць убрана ў бліжэйшыя дні. Гэта задача можа быць выканана, калі саўгасу дапамогуць суседнія калгасы і аднаасобнікі. Раённыя арганізацыі абавязаны гэту дапамогу арганізаваць, рашуча ўдарыўшы па апартуністычнай недаацэнцы ўзаемадапамогі паміж саўгасам і калгасамі.

Ч. Н.

Ударнікі калгаснай сьвінагадоўлі

На ўсебеларускай нарадзе загадчыкаў сьвінагадоўчых калгасных таварных фэрм

Выклік тав. Шпакава—

ЗАХАВАЦЬ 12 ПАРАСЯТ АД КОЖНАГА АПАРОСУ—

прымаюць лепшыя ўдарнікі калгаснай сьвінагадоўлі

У сакавіку 1930 г. у саўгасе «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ», Аршанскага раёну, арганізавалася сьвінагадоўчая фэрма. Калгас вылучыў для гэтай фэрмы 7 сьвінаматак. Загадчыкам фэрмы быў назначан член праўленьня калгасу тав. ШПАКАЎ (кандыдат партыі).

За год фэрма дасягнула значных посьпехаў і можа паслужыць прыкладам многім іншым фэрмам БССР.

ЗАРАЗ НА ФЭРМЕ ЎЖО ЁСЬЦЬ 75 СЬВІНАМАТАК І 60 ПАРАСЯТ 2-ХМЕСЯЧНАГА ЎЗРОСТУ. УСЁ СТАДА ФЭРМЫ СКЛАДАЕЕЦЦА З 225 ШТУК.

ЗА ГОД НА ФЭРМЕ НЯ БЫЛО НІ АДНАГО ВЫПАДКУ ЗДЫХАНЬНЯ СЬВІНЕЙ АБО ПАРАСЯТ.

Сьвіньні трымаліся ў звычайных сляпянскіх пунях, але заўсёды былі ў чыстаце, штодзенна ім падсьцілалі сьвежую салому, выбіралі гной. Сьвіней кармілі тры разы ў дзень, кожны раз пасьля кармленьня кармушкі мыліся гарачай вадой. Сьвіней штодзенна выпускалі на прагулку. За сьвіньнямі наглядалі тры сьвінаркі.

Як толькі прасохла зямля, сьвіней выгналі на пашу. Сам загадчык фэрмы Шпакоў часта пасе сьвіней і сочыць за злучкай.

Фэрма ўжо здала дзяржаве 12 ТАВАРНЫХ СЬВІНЕЙ, зараз на адкорме знаходзяцца яшчэ 10 сьвіней.

Падзяліўшыся аб дасягненьнях сваёй фэрмы на ўсебеларускай нарадзе загадчыкаў сьвінагадоўчых калгасных таварных фэрм, т. Шпакоў выклікаў усе фэрмы БССР на сацыялістычнае спаборніцтва.

ТАВ. ШПАКОЎ УЗЯЎ НА СЯБЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА ВЫГАДАВАЦЬ АД АДНАГО АПАРОСУ 10 МАТАК 120 ПАРАСЯТ.

Выклік тав. Шпакова сустрэў гарачы водгук з боку загадчыкаў фэрм.

Загадчык фэрмы калгасу імя Х-цігодзьдзя БССР, Магілеўскага раёну, тав. ІВАНОВА ўзяла на сябе абавязак здаць дзяржаве за год 15 таварных падсьвінкаў ад кожнай сьвінаматкі. Загадчыкі фэрмаў калгасаў «ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ» і імя Калініна, Церахаўскага раёну т. т. ПАЎЛЕНКАЎ і ЦУБРЫКОВА абавязаліся заданьне па гадоўлі парасят перавыканаць на 10 проц.

Загадчык фэрмы калгасу «Чырвоная рудня», Жлобінскага раёну, КУДАЛЕЙ абавязаўся гадаваць кожны год ад кожнай сьвінаматкі 14 парасят і выканаць дагавор па здачы таварных сьвіней. Загадчык фэрмы калгасу «Новае жыцьцё», Старобінскага раёну, Пратасеня, абавязаўся выгадаваць за год 15 таварных сьвіней ад кожнай сьвінаматкі.

Такія-ж абавязацельствы прынялі на сябе загадчыкі фэрм калгасаў «НОВЫ СЬВЕТ», Чэрвеньскага раёну, імя ДОМБАЛЯ, Барысаўскага раёну, «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ», Чавускага раёну, «КАМІНТЭРН», Уваравіцкага раёну, «БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ», Клімавіцкага раёну, «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ», Жыткавіцкага раёну, «ЧЫРВОНЫ СОРМАВЕЦ», Чэрыкаўскага раёну.

Лепшыя ўдарнікі-сьвінары і загадчыкі сьвінагадоўчых калгасных таварных фэрм паказваюць узоры змаганьня за калгасную таварную сьвінагадоўлю. За кароткі час існаваньня фэрм, дзякуючы энэргічнай рабоце, яны дабіліся сапраўдных посьпехаў.

Гэтых ударнікаў павінны ведаць усе калгасьнікі БССР. Вось яны.

ДАВЫДОВІЧ ВАСА — старшая сьвінарка-ўдарніца калгасу «КАМБАЙН», Слуцкага раёну, з выключнай адданасьцю працуе на сьвінарніках. У часе марозаў узімку, калі сьвінаматкі не падпускалі да сябе сваіх парасят, Давыдовіч паіла іх малаком ложкай і грэла іх у сваёй хаце на печы. Дзякуючы гэтаму яна выгадавала ўсіх парасят, якіх даглядала. Дзякуючы добраму догляду сьвіней, які арганізавала Давыдовіч, у калгасе ня было страт.

***

БЯЗУНОЎ М. Р. — загадчык фэрмы калгасу ІМЯ XIII ГОДЗЬДЗЯ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ, Бялыніцкага раёну. Зараз на фэрме — 280 сьвіней. Амаль скончана будаўніцтва сьвінарніка на 300 штук. Уся работа пераведзена на зьдзельшчыну. Кармленьне сьвіней робіцца па норме.

***

ДЗЯДОВА Н. — старшая сьвінарка-ўдарніца калгасу «КАМІНТЭРН», Крычаўскага раёну. Дзякуючы ўдарнай рабоце Дзядовай, на фэрме ЗУСІМ НЯМА ЎПАДКУ СЬВІНЕЙ АД ХВАРОБ. Работа пераведзена на зьдзельшчыну. Сьвіньні разьбіты на групах і прымацаваны да асобных сьвінарак. Ня гледзячы на павялічэньне стада на 50 сьвіней, брыгада на фэрме засталася тая-ж самая.

***

БАЦЬКОЎ М. — старшы сьвінар фэрмы КАМУНЫ ІМЯ КАРЛА ЛІБКНЭХТА, Быхаўскага раёну. Па яго ініцыятыве работа на фэрме пераведзена на зьдзельшчыну. У сьвінарніках захоўваецца чыстата. Сьвіньні знаходзяцца на пашы. 85 ПРОЦ. ПАРАСЯТ ГАДУЮЦЦА.

***

ПАЧАСУЙ — загадчык фэрмы калгасу «КАСТРЫЧНІК», Чэрвенскага раёну. На фэрме 275 штук, у тым ліку 104 сьвінаматкі. Сьвіньні знаходзяцца на пашы, разьбіты на групах і прымацаваны да асобных сьвінароў.

***

САЎЧАНКА П. — загадчык фэрмы калгасу «ПРАЎДА», Клімавіцкага раёну. Дзякуючы яго энэргіі стада фэрмы за кароткі час падвоілася. Палепшыўся догляд сьвіней. Работа пераведзена на зьдзельшчыну.

Усе гэтыя ўдарнікі калгаснай сьвінагадоўлі за прыкладную работу, а таксама загадчык фэрмы калгасу «Ленінскі шлях» тав. Шпакоў прэміяваны на ўсебеларускай нарадзе загадчыкаў сьвінагадоўчых калгасных таварных фэрм.

410 ГА СЕНАЖАЦЯЙ

убралі за 23 дні

Саўгас СТРЭЛІЧАВА, Хойніцкага раёну, 18 ліпеня скончыў касьбу і ўборку 410 га сенажацяй. Плян уборкі сенажацяй выканан у разьмеры 160 проц. за кошт прырэзкі новых лугоў.

Такіх ударных тэмпаў у рабоце саўгас дабіўся дзякуючы энэргічнай рабоце і добраму кіраўніцтву дырэктара саўгасу тав. Кучаравага і намесьніка Турскага, а таксама дзякуючы масава-растлумачальнай рабоце, якую правялі ячэйка і рабачком сярод усяго калектыву рабочых.

У часе ўборкі на сенажаці была арганізавана кухня. Дзякуючы добра наладжанаму грамадзкаму харчаваньню і масавай растлумачальнай рабоце сенаўборка была скончана ЗА 23 ДНІ.

Цяпер саўгас прыступіў да ўборкі азімых і вікі. Будаўніцтва ў саўгасе таксама разгортваецца з посьпехам. Скотны двор ужо пабудаваны на 75 проц. і дом для рабочых—на 30 проц. Галубовіч.

АД РЭДАКЦЫІ: За сапраўды бальшавіцкія тэмпы на сенажацях мы высоўваем на прэмію калектыў саўгасу Стрэлічава.

Прыклад усяму раёну

МАЗЫР. (Наш кар.). Камсамольскія ячэйкі камуны «АВАНГАРД» і калгасу «НОВЫЯ ХАЛАДНІКІ» паказваюць прыклад усяму раёну ў барацьбе за сілас. У калгасе «Новыя халаднікі» КАМСАМОЛЬЦЫ ВЫКАПАЛІ 4 ЯМЫ І ЗАСІЛАСАВАЛІ 84 ТОНЫ ЗЯЛЁНАЙ МАСЫ. У камуне «Авангард» КАМСАМОЛЬЦЫ ЗАСІЛАСАВАЛІ 41 ТОНУ.

Затое райкалгассаюз аб тым, як ідзе сіласаваньне ў раёне ня ведае, бо гэтай справай зусім ня кіруе. Райком камсамолу толькі 6 ліпеня камандыраваў у сельсаветы 35 камсамольцаў для разгортваньня сіласнай кампаніі. Ю.

Яшчэ рана пачынаць „сіласаваньне“

—так лічаць апартуністы шклоўскага райза і райкалгассаюзу

У калгасе «Шлях сацыялізму» па ініцыятыве камсамольцаў у выходны дзень быў арганізован суботнік, у часе якога камсамольцы разам з калгасьнікамі выкапалі яму на 100 тон і поўнасьцю яе засіласавалі. У Сьлізкоўскім сельсавеце камсамольцы сваімі сіламі выканалі сіласную яму.

Але ход сіласнай кампаніі па раёне вельмі нездавальняючы. З 3.600 тон паводле пляну засіласавана толькі 106. Райкалгассаюз, райза і МТС сіласаваньнем у раёне зусім ня кіруюць. Працаўнікі гэтых устаноў лічаць, што «яшчэ рана пачынаць сіласную кампанію». У выніку ў раёне вырыта ўсяго 540 кбм. ям і траншэй.

Зрыўшчыкі сіласаваньня, якія спадзяюцца на самацёк, павінны атрымаць рашучы адпор. Усе калгасьнікі і камсамольцы раёну павінны ўзяць прыклад з камсамольцаў калгасу «Шлях сацыялізму». Я.

Калгасьнік на ўборцы

Даволі ігнараваць сілас

Пастанова СНК БССР

Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што сіласнае будаўніцтва і сіласаваньне ў БССР праходзіць зусім нездавальняюча. У Быхаўскім, Брагінскім Буда-Кашалёўскім, Веткаўскім, Глускім, Дубровенскім, Жлобінскім, Мазырскім, Менскім, Пятрыкоўскім, Уваравіцкім і іншых раёнах праца па сіласаваньні амаль не пачата.

На 10 ліпеня 1931 г. плян будаўніцтва ям і траншэй выканан на 7,2 проц. засіласавана 0,5 проц. Амаль нічога ня зроблена ў справе сіласаваньня ў аднаасобным сэктары; устаноўка сіласных вежаў выканана толькі на 1,2 проц. плян будаўніцтва сіласных вежаў выкананы на 50 проц. Ёсьць выпадкі адгрузкі сіласных вежаў няпоўнымі камплектамі і псаваньня іх пры перавозцы на чыгунцы і пры выгрузцы; несвячасова адгружаюцца ў пункты будаваньня вежаў патрэбныя матар'ялы.

Бяручы пад увагу паказанае вышэй Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

Абвясьціць старшынь раённых выканаўчых камітэтаў, дырэктароў сельскагаспадарчых трэстаў т. т. Грэбенчыка, Аўчыньнікава, Мартэнсона, Макушына, Вайцяховіча, нам. старшыні Белкалгасцэнтру т. Стрэле, дырэктара бел. аддзяленьня Трактарацэнтру т. Карпакевічу стварыць пры машына-трактарных станцыях сіласаўборачныя агрэгаты (трактар, касілка, сіласарэзка) і разам з гэтым забясьпечыць сіласарэзкі, якія ёсьць у калгасах па-за раёнамі дзейнасьці машына-трактарных станцый трактарамі, правёўшы гэтую працу на дагаворных падставах.

Абавязаць упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Шляхоў пры СНК БССР забясьпечыць своечасовую дастаўку сіласных веж і зьнішчыць недахопы пры іх перавозцы.

Для непасрэднага кіраваньня сіласаваньнем абавязаць машына-трактарныя станцыі, саўгастрэсты, Белсельаб'яднаньне, Белкалгасцэнтр і Белхлебажывёласаюз камандыраваць у раёны, якія найбольш адстаюць, адказных працаўнікоў.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Зямляробства, Белкалгасцэнтру і кіраўнікам саўгастрэстаў галоўную ўвагу пры сіласаваньні зьвярнуць на сіласаваньне ў ямах і траншэях і ўжыць усе захады да таго, каб тыя сіласныя вежы, якія пасланы на месца, былі своечасова пабудаваны.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Зямляробства і Белкалгасцэнтру тэрмінова даць указаньне саўгасам і калгасам аб тым, што плян сіласаваньня, вызначаны для кожнага паасобнага саўгасу і калгасу, павінен быць выканан таму, што паводле вызначаных плянаў сілас уключаецца ў кармовы балянс даннай гаспадаркі і на падставе гэтага вызначаюцца нормы загатоўкі сена, саломы і інш. кармовых культур.

Абавязаць старшынь раённых выканаўчых камітэтаў і кіраўнікоў гаспадарчых сыстэм і арганізацый рашуча павялічыць падлік працы па правядзеньні сіласаваньня і своечасова ва ўстаноўлены тэрмін падаваць зводкі Народнаму Камісарыяту Зямляробства.

Нам. старшыні Савету Народных Камісараў БССР БЭНЭК.
Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР КАНДЫБОВІЧ.

Як пабудаваць мясцовымі сродкамі ільняную малатарню „Эддзі“

Лён вельмі працаёмістая культура. У сувязі са значным пашырэньнем плошчы пад ільном у БССР у гэтым годзе (супроць мінулага на 61,3 проц.) і неабходнасьцю своечасова ўбраць яго і апрацаваць паўстае неабходнасьць як можна лепш і паўней выкарыстаць усе тыя ільняныя машыны, якія ёсьць у наяўнасьці ў раёнах і якія завозяцца да сэзону. Абмалот гадовак ільну, калі яго рабіць ручным спосабам, патрабуе шмат часу. Але пры дапамозе вельмі простай машыны—ільняной малатарні «Эддзі», якая лёгка можа быць зроблена непасрэдна ў самым калгасе, можна значна скараціць час работы па абмалоце пры вялікай затраце часу. Так, за 10-цігадзін ны дзень два рабочыя лёгка могуць абмалаціць на гэтай малатарні 4.000 вязанак ільну, або сярэдні ўраджай з 2,5-3 га.

Гэтыя машыны ў БССР не завозяцца і павінны быць зроблены Белсампрамсаюзам да пачатку сэзону ў колькасьці каля 800 шт., але ўсё-ж і гэтай колькасьці будзе мала.

Вось таму трэба зараз-жа самім калгасам распачаць выраб гэтых машын. Наркамзем БССР разаслаў кожнаму райземаддзелу дэтальныя чарцяжы і апісаньне гэтай малатарні. У кожны калгас, які хоча зрабіць такую машыну, можа зьвярнуцца ў райза за чарцяжамі і тлумачэньнямі. Адначасова даем кароткае апісаньне машыны і схэматычны малюнак яе.

Малатарня тыпу «Эддзі» складаецца з драўлянай рамы, якая зьвязана з чатырма брускамі—стойкамі для моцнасьці, зьвязанымі брусьсямі ўнізе (разьмеры гл. на чарцяжы).

Зверху рамы ў гарызантальнай плоскасьці паложаны ў падшыпніках (з якіх адна пара рухомых—не замацаваных наглуха) два жалезныя валы дыям. па 40-45 м.м. і даўжынёй па 1.550 м.м., на якіх насаджаны чатыры барабаны—два з аднаго боку і два з другога.

Барабаны драўляныя, зробленыя з шасьці драўляных дыскаў (пажадана з бярозавых або кляновых дошак) склеенных і сьцягнутых чатырма балтамі кожны. Разьмер барабанаў—дыям. 230 м.м., даўжыня—408 м.м. Яны абшываюцца скурай, можна і не абшываць, калі скуры няма. На адным з валаў, які ляжыць у глухіх падшыпніках, насаджан драўляны шкіў, дыям. 250 м.м. і шырынёй 125 м.м., на які адзяваецца прыводны нас ад конскага прыводу або мэханічнага рухавіка. Другі вал прыводзіцца ў рух ад трэньня яго барабанаў з барабанамі вала, на якім насаджан шкіў, прычым, каб забясьпечыць прыцісканьне ва лоў на другі вал, праз накладку, націскае рэсорная спружына,—калі яе няма, можна паставіць дзьве сьпіральныя на абодных бакох накладкі. На валах з унутраных бакоў ставіцца па ўпорнай жалезнай шайбе, або робіцца заточкі, каб ня было руху валаў у бок.

Вось і ўся ў асноўным канструкцыя гэтай вельмі простай, але вельмі прадукцыйнай машыны.

Як відаць, для сваёй пабудовы гэта машына не патрабуе нічога складанага—яе зрабіць лёгка з тых матар'ялаў, якія ёсьць пад рукамі; на валы можна скарыстаць старыя восі калёс, або трансмісіі, на падшыпнікі—старыя падшыпнікі машын адпаведнага дыям., замест рэсор можна ставіць зубі ад спружынавак, а дрэва заўсёды ёсьць у гасподарцы, з якога брусы патрэбных разьмераў лёгка абчасаць.

Калі ёсьць рухавік, дык замест аднэй малатарні можна прыводзіць у рух некалькі штук—3-4 да 6-ці, прычым малатарні ставяцца адна за другой і злучаюцца схваткамі ці балтамі, або раму робяць з даўгіх брусоў, на якую і ўстанаўляюцца барабаны (гл. схэму).

Працуе гэта машына так:

Па абодных бакох становяцца па адным рабочым, якія бяруць па снопе і вяршкамі зьверху ўніз пускаюць паміж барабанаў. Барабаны круцяцца з хуткасьцю 225-240 абаротаў у хвіліну, раздушваюць галоўкі ільну, семя якіх падае з мякінай на ток і потым на арфе ачышчаецца ад мякіны. Сноп укладваецца два-тры разы, пакуль усе галоўкі ня будуць абабітыя, а потым бярэцца другі сноп і робіцца тое-ж самае.

Зварачаем увагу ўсіх калгасаў, якія маюць значныя пасевы ільну, асабліва ў ільнаводчых раёнах, на неабходнасьць наладжаньня вырабу гэтых машын. Трэба зараз-жа разгарнуць іх выраб, не чакаючы атрыманьня машын праз райкапсаюзы і Белсельгаспаб.

Інспэктар па тэхдапамозе НКЗБ СКІБА.



МАГНІТАБУД ЧАКАЕ

Чыгуначнікі БССР, змагайцеся за найхутчэйшую дастаўку грузаў для Магнітабуду!

Адкрыты ліст рабочых доменнага цэху Магнітабудуду рабочых і служачых чыгунак: Беларуска-Бальтыцкай, Кастрычніцкай, Маскоўска-Казанскай, Самара-Златаустаўскай, Пермскай і да рабочых Ленінградскага порту

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Будаўніцтва Магнітагорскага гіганта ўступіла ў рашаючы пэрыяд. Кароткі час, які застаўся да пуску першай чаргі заводу, мы, рабочыя доменнага цэху Магнітабуду, ушчыльняем гадзінамі напружанай работы. У паказаны партыяй тэрмін мы абавязаліся пусьціць завод. Да 1 кастрычніка домны Магнітагорскага мэталюргічнага камбінату павінны ва што-б ні стала даць чыгун.

Зьмятаючы на сваім шляху апартуністаў усіх масьцей мы б'емся за найвышэйшыя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва. Пераганяючы ўсе ўстаноўленыя капіталістычнай практыкай тэрміны, мы абавязаліся правесьці кладку агнятрывалай цэглы ў каўпэрах замест 85 дзён у 65 дзён. Але для выкананьня намі гэтага абавязацельства патрэбна ў пару даставіць на пляцоўку Магнітабуду звыш 75 маршрутаў імпартнай агнятрывалай цэглы. Пачынаючы з 15 ліпеня па 1 верасьня, цаля 3.000 вагонаў цэглы павінны быць дастаўлены ў найкаразей шыя тэрміны з Нямеччыны і Англіі. Рашаючым момантам у вырашэньні гэтай задачы будзе ЯКАСЬЦЬ І ТЭМПЫ РАБОТЫ НАШАГА ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ.

Таварышы чыгуначнікі! Мы, рабочыя доменнага цэху, згуртаваныя калектыўнай воляй перамагчы, зьнішчыць усе перашкоды труднасьцяй, клічам вас на барацьбу за выкананьне наказу партыі. Устаноўдены НКШЗ тэрмін руху маршрутаў ад граніцы да пляцоўкі ў 20 дзён мы лічым вельмі вялікім. Такі тэрмін можа затармазіць пуск заводу да 1 лістапада.

ПРАЛЕТАРЫ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ! Ад вас залежыць скарачэньне тэрміну прабегу маршрутаў з агнятрывалай цэглай. Ударнай работай, асобнай увагай да гэтых маршрутаў вы можаце дабіцца таго, каб яны былі ў дарозе не 20 дзён, а 12, максымум 15 дзён.

Таварышы грузчыкі Ленінградскага порту! Ад якасьці і тэмпаў вашай работы таксама залежыць тэрміновасьць і добраякаснасьць дастаўкі на пляцоўку Магнітабуду імпартнай цэглы. Памятайце, што за кожную цагліну дзяржава заплаціла валютай. Асьцярожнай укладкай у вагоны, беражлівымі адносінамі да каштоўнейшай цэглы вы дапаможаце нам скончыць будоўлю буйнейшых у сьвеце доменных печай. Максымальна павялічыўшы тэмпы перагрузкі з параходаў у вагоны, зьменце тэрміны дастаўкі цэглы на Магнітабуд.

ТАВАРЫШЫ ДЫСПЭТЧЭРЫ, ЧЫГУНАЧНЫЯ АГЕНТЫ, ДЗЯЖУРНЫЯ ПА СТАНЦЫІ, КАНДУКТАРСКІЯ БРЫГАДЫ! АД ВАС ЗАЛЕЖЫЦЬ ШПАРЧЭЙШАЕ ПРАСОЎВАНЬНЕ МАРШРУТАЎ АД НЕГАРЭЛАГА І ЛЕНІНГРАДУ ДА МАГНІТАБУДУ. Мы патрабуем ад вас найвышэйшай шчыльнасьці. Ні адзэй хвіліны лішняй стаянкі.

Загадзя ачысьціце шлях! ад іншых складаў, шпарка і выразна давайце пуцёўкі.

Адкрыць сэмафоры маршрутам Магнітабуду — вось чаго мы ў праве ад вас патрабаваць і патрабуем.

ПАРАВОЗНЫЯ МАШЫНІСТЫ! Трымайце напагатове вагары. Вашы паравозы павінны разьвіць максымальную шпаркасьць. Ніякіх папомак у дарозе, ніякіх затрыманьняў з-за рамонту. Нехай плякаты Магнітабуду, наклееныя на вагоны, пасепяць у вас трывогу за пёс рашаючых грузаў!

ТАВАРЫШЫ КАМСАМОЛЬЦЫ! Да вас мы асобна зварачаемся. Выпучыць спэцыяльных таварышоў ці групы камсамольцаў для нясупыннага кантролю над рухам магнітагорскіх маршрутаў. Мабілізуйце грамадзкую ўвагу вакол пытаньняў транспартаваньня магнітабудаўскіх грузаў і ў першую чаргу імпартнай агнятрывалай цэглы. Выстаўляйце пасты наглядаў на шляхох, выкрывайце нядбайнікаў і лодыраў, якія тармозяць прасоўваньне спэцыяльных маршрутаў для Магнітабуду.

Мы глыбока перакананы, ШТО РАБОЧЫЯ І СЛУЖАЧЫЯ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ ЗРАЗУМЕЮЦЬ усю палітычную важнасьць пуску Магнітагорскага гіганта ў тэрмін, паказаны партыяй. Мы ўпэўнены, што чыгуначнікі не захочуць быць у радох адсталых і напружаньнем усіх сіл і волі дапамогуць нам дабіцца бліскучай перамогі на фронце гіганцкага сацыялістычнага будаўніцтва.

РАБОЧЫЯ ДОМЕННАГА ЦЭХУ МАГНІТАБУДУ.

За шчыльную ўвязку навукі з задачамі сёнешняга дня

19 ліпеня адбылося чарговае пасяджэньне акадэмічнага савету Беларускай акадэміі навук. Работа гэтага савету мае вялікае значэньне як у будаўніцтве самой акадэміі, так і ў разгортваньні навукова-дасьледчай работы ў маштабе БССР.

Акадэмічны савет разглядаеў два пытаньні: 1) справаздачу аб работе БАН за пэўгода і 2) сканструіраваньне прэзыдыуму акадэміі.

Характэрнымі асаблівасьцямі работы гэтага пленуму зьяўляецца тое, што ў разгорнутых сірочках на дакладу прэзыдэнта БАН былі пастаўлены важнейшыя і актуальнейшыя праблемы навукова-дасьледчай работы ў БССР.

Усе выступаўшыя аднадушна падкрэслівалі, што Акадэмія на працягу гэтага паўгода сапраўды стала на шлях рашучай перабудовы сваёй работы над пунктам здолжаньня шчыльнай увязкі навукі з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. Акадэмія зрабіла рашучы крух у пераходзе на новыя мэтады работы ў пэратыўнасьці яе з Акадэміі з акадэмаўскім кіраўніцтвам ў Акадэмію савецкую — пралетарскую.

Акадэмія нанова перабудавала сваю структуру, стварыўшы сыстэму навуковых інстытутаў. Яна высунула перад інстытутамі якраз такія праблемы, якія шчыльна набліжаюць работу кожнага інстытуту да выкананьня актуальных задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Акадэмія правяла вялікую ідэалёгічную барацьбу са старой нацдэмаўскай спадчынай. Навуковая прадукцыя Акадэміі, падрыхтаваная за гэтае паўгодзьдзе, зьяўляецца даволі значнай па колькасьці і каштоўнай на сваёй якасьці.

Гаворачы аб перабудове работы акадэміі, неабходна падкрэсьліць, што яшчэ ня ўсе інстытуты дабіліся патрэбнага пералому ў сваёй працы. Слаба працуюць яшчэ такія інстытуты, як гісторыі, літаратуры, эканомікі, савецкага будаўніцтва і біолёгічных навук.

Вялікім прарывам у агульнай сыстэме работы акадэміі зьяўляецца дасягнасьць хэмічнага інстытуту, які ня толькі ня змог узяцца за вырашэньне важнейшых праблем, але ў сваёй практычнай работе дапусьціў рад палітычных памылак. Інстытуты гэалёгічны, хэмічны і эканамічных навук дагэтуль не сканцэнтравалі сваёй увагі на мэталюргічнай праблеме БССР. Інстытут эканомікі не перабудаваў сваёй работы пад кутом погляду вывучэньня перш за ўсё вытворчых сіл краіны.

Адзначыўшы гэтыя недахопы, эканамічны савет даў прэзыдыуму канкрэтныя паказаньні адносна выжыцьця іх у далейшай работе Акадэміі. Пленум як асабліва важную задачу высунуў перад прэзыдыумам пытаньне аб разгортваньні работы камісій Заходняй Беларусі па пытаньнях вывучэньня ў гэтым напрэмку раду праблем. Пленум канчаткова сканструіраваў прэзыдыум Акадэміі, абраўшы аднагалосна ў яго склад наступных таварышоў: 1) Горын — прэзыдэнт, 2) Якуб Колас—віцэ-прэзыдэнт, 3) Шчэрбакоў — віцэ-прэзыдэнт, 4) Панкевіч—неадменны сакратар і члены прэзыдыуму т.т. Рыўлін, Ашароўч, Платун, Пятровіч, Вальфсон, Сэрбэнта, Кроль.

НЕАДКЛАДНА ЗАВЯРШЫЦЬ

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

перабудову партыйнай работы ў каапэрацыі

За канкрэтнасьць і апэрацыйнасьць

Ход дэкадніка праверкі паказвае, што дырэктывы партыі і ўраду аб перабудове работы каапэрацыі ў адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва і з узрастаючымі запатрабаваньнямі рабочых мас, аб паляпшэньні іх матар'яльна-бытавога абслугоўваньня выконваюцца вельмі марудна.

Мясцовыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі не забясьпечылі сваёй работай яшчэ колькі-небудзь значнага зруху ў справе барацьбы з недахопамі ў рабоце каапэрацыі, яе коснасьцю, непаваротлівасьцю і фактамі фармальных адносін да работы. У рэзультаце—чаргі не зьнішчаюцца, застаецца, як і раней, нядобраякасная пастаноўка ў радзе выпадкаў грамадзкага харчаваньня і інш.

У рабоце паасобных партарганізацый па кіраўніцтве каапэрацыяй наглядаюцца элемэнты простай фармальнасьці. «Заслухалі», «пастанавілі» і ўсё. Прыкладам такога «кіраўніцтва» зьяўляецца ШКЛОЎСКІ РК, Бюро парткалектыву заводу «КАМУНАР» замест таго, каб забясьпечыць штодзённае кіраўніцтва работай свайго ЗРК, арганізаваўшы там парт'ячэйку, абмежавалася выпучаньнем на пастаянную работу толькі аднаго партыйца. Яшчэ да гэтага часу вамногіх мясцох не завершана нават арганізацыйная перабудова партыйнай і прафсаюзнай работы.

Недавацэнка перабудовы партработы каапэрацыі з боку паасобных партарганізацый, нерашучая настойлівасьць у барацьбе па зьнішчэньні недахопаў рабочай каапэрацыі выплывае з таго неразуменьня, што БАРАЦЬБА ЗА ПАЛЯПШЭНЬНЕ РАБОТЫ КААПЭРАЦЫІ, ПАЛЯПШЭНЬНЕ МАТАР'ЯЛЬНА-БЫТАВОГА І КУЛЬТУРНАГА АБСЛУГОЎВАНЬНЯ РАБОЧЫХ МАС ЁСЬЦЬ ЗАДАЧА БАРАЦЬБЫ ЗА ПРАМФІНПЛЯН, ЗА ДАЛЕЙШЫЯ ПОСЬПЕХІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

Зараз, калі посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва падвалі базу да яшчэ большага паляпшэньня матар'яльна-бытавога абслугоўваньня рабочых, нельга супакойваць сяба тым, што сучасная забясьпечэньне рабочых шмат лепшае чым раней. Такое самасупакаеньне нікуды ня годная справа. «Толькі гнілыя і насквозь пратухлыя людзі могуць пацяшацца спасылкамі на мінулае» (Сталін).

Рабочая кляса ў барацьбе за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады праўўпле вялізарнейшы творчы энтузіязм, самаддана змагацца пад кіраўніцтвам партыі за ажыцьцяўленьне яе генэральнай лініі, напружаючы свае сілы на перамаганьне труднасьцяй росту сацыялістычнага будаўніцтва. Рабочыя масы працуюць сапраўднымі сацыялістычнымі мэтадамі і ўдарнымі тэмпамі. "Ажыцьцяўляючы гэтыя задачы партыі і ўлады, «рабочыя будуць у сваю чаргу патрабаваць ад яе (улады—рэд.) выкананьня яе абавязкаў па далейшым паляпшэньні матар'яльнага і культурнага становішча рабочых» (Сталін).

Гэтай задачы далейшага паляпшэньня матар'яльна-бытавога і культурнага абслугоўваньня рабочых павінна быць пад парадкавана ўся работа спажывецкай каапэрацыі. Перабудовай яе работы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі сацыялістычнага будаўніцтва партарганізацыі павінны забясьпечыць бязумоўнае выкананьне дырэктыў партыі і ўраду. Трэба васьці БОЛЬШ РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ ПА ВЫКАРЧОЎВАНЬНІ АПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫКІ І АБЛОМАЎШЧЫНЫ ў рабоце каапэрацыі, па ачышчэньні яе апарату ад чужых элемэнтаў.

Менш мітусьні і гаварыльні, больш канкрэтнасьці і апэрацыйнасьці ў кіраўніцтве работай каапэрацыі. Такова задача партакалектываў і ячэек КП(б)Б.

Роткевич

Перабудова на паперы

У Шкловскім раёне каапэрацыя не перабудавала сваю работу ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і ўраду аб паляпшэньні работы. Каапэрацыйны аппарат працуе надавычай кепска, кіруючыя раённыя органы ня цікавяцца станам работы каапэрацыі, таму ня дзіва, што ў каапэрацыі пануе бюракратызм, цягаціна і растраты. Вясковыя партячэйкі (Княжыцкая, Фашчыўская, Гарадзішчанская і інш.) ацэнім стаяць у баку ад работы аддзяленьняў спажыўкаапэрацыі.

Райком партыі заслухаў даклад фракцыі райсаюзу аб становішчы перабудовы работы каапэрацыі, вызначыў адпаведныя мерапрыемствы для паляпшэньня гэтай работы, але гэтыя мерапрыемствы засталіся толькі на паперы. У жыцьцё яны не праводзяцца.

Ян.

Топчуцца на месцы

Выкананьне дырэктыў партыі аб паляпшэньні забесьпячэньня рабочых знаходзіцца ў простай залежнасьці ад пастаноўкі работы спажывецкай каапэрацыі. Аднак, непаваротлівасьць апарату МЦРК, фармальныя адносіны да перабудовы работы працягваюцца, у рэзультаце чаго стварацца затаварваньне, няма патрэбнага зруху ў справе паляпшэньня абслугоўваньня рабочага спажыўца.

Аднэй з асноўных прычын гэтых недахопаў зьяўляецца адсутнасьць запікаўленасьці з боку работнікаў каапэрацыі справай павялічэньня тавараабароту паасобных магазынаў МЦРК.

Гаспадарчы разрахунак, аснованы на самастойным балянсе нізавых каапэрацыйных зьвеньняў, прэміяльна-зьдзельная аплата работы — асноўныя ўмовы ліквідацыі гэтых недахопаў. Зараз усе магазыны МЦРК пераведзены на гаспадарчы разрахунак, але толькі адзін з іх працуе на самастойным балянсе. На такую сыстэму работы толькі яшчэ мяркуецца паравесьці рад буйных магазынаў.

Амаль ва ўсіх магазынах МЦРК ужо з 1-га ліпеня работнікі прылаўкаў аплачваюцца на прэміяльна-зьдзельнай сыстэме. Між тым, патрэбных вынікаў ад увядзеньня гэтых мерапрыемстваў усё-ж няма. Гэта тлумачыцца тым, што гаспадарчы разрахунак і зьдзельшчына ўведзена зьверху габінэтным парадкам. Яшчэ да гэтага часу большасьць работнікаў прылаўка ня ведаюць аб тым, што яны аплачваюцца ў залежнасьці ад выпрацоўкі.

Адсутнасьць масавай работы, вусім нязначны (25 проц.) абгрунтаваны на фармальных, трафарэтных без канкрэтных абавязкаў дагаварох,ахоп спаборніцтвам і ўдарніцтвам работнікаў — галоўныя алтнакі бязьдзейнасьці прафарганізацыі МЦРК.

Там, дзе работнікі прылаўка знаёмы з сутнасьцю ўведзеных мерапрыемстваў, у рабоце магазынаў мае месца значнае паляпшэньне. Так, у магазыне № 17 быў выпадак перагрузкі ў адным з яго аддзелаў, што стварыла вялікую чаргу, ў той час, як у другіх аддзелах магазыну работнікі прылаўка стаялі без работы. Узяўшыся за работу на аснове зьдзельшчыны па водпуску тавараў, свабодныя работнікі з іншых аддзелаў спрылялі ліквідацыі ў некалькі хвілін чаргі. Зарплата ў такіх магазынах ужо за ліпень будзе вышэйшай на 5-10 проц.

Але выпадкі такіх вынікаў адзінкавыя, што дае права адзначыць невыстарчальнае кіраўніцтва гандлёвай дзейнасьцю МЦРК з боку партыйнага калектыву. Рад фактаў гаворыць за тое, што бюро парткалектыву ў перабудове работы топчуцца на месцы, яя ўмее ўвязаць гэтай перабудовы з задачамі ўзмацненьня кіраўніцтва вытворчасьцю, аб чым ужо адзначалася ў нашай газэце.

Праўда, колькасны склад партарганізацыі МЦРК параўнальна невялікі. Але гэта ні ў якім разе ня можа служыць апраўданьнем бязьдзейнасьці. Наадварот, у такім выпадку ад партыйнай арганізацыі патрабуецца максымальная гібкасьць, выразнасьць у рабоце і дысцыпліванасьць, чаго на справе няма. Парткалектыў павінен уцягнуць у актыўную работу камсамольскі калектыў МЦРК, які амаль зусім не працуе.

Перад бюро парткалектыву МЦРК стаіць задача — уцягнуць у актыўную работу кожнага члена партыі, кожнага камсамольца, перайсьці на канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва работы, шырока разгарнуць масавую работу сярод супрацоўнікаў МЦРК, і гэтым самым забясьпечыць ліквідацыю недахопаў і ўзьнікаў работу МЦРК на вышыню задач, якія пастаўлены партыяй перад каапэрацыяй.

К—Р.

Апартуністычны спакой да задач паляпшэньня грамадзкага харчаваньня

Партыйны калектыў фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» сваёй работай забясьпечыў некаторыя практычныя мерапрыемствы па паляпшэньні абслугоўваньня рабочых каапэрацыяй. Парткалектыў здолеў уцягнуць усю грамадзкасьць фабрыкі ў справу ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўраду аб рабоце каапэрацыі..

Сіламі і сродкамі рабочых фабрыкі арганізавана фэрма ЗРК на плошчы больш 300 га. Аднак, ня гледячы на вялікую работу, праведзеную парткалектывам, усё-ж ЗРК фабрыкі і зараз далёка ня выконвае сваіх аснoўных, першачарговых задач па паляпшэньні рабочага забесьпячэньня. Прычыны заключаюцца ў тым, што, як праўленьне Барысаўскага ЦРК, так і праўленьне Белкаапсаюзу фармальна-бюракратычна адносяцца да задач паляпшэньня работы каапэрацыі. ЗРК фабрыкі, які абслугоўвае больш 4.000 рабочых, ня ўключаны ў пляны забесьпячэньня і крэдытаваньня. Фэрма ЗРК будавалася выключна на сродкі рабочых без усякай дапамогі Белкаапсаюзу. Праўленьне Барысаўскага ЦРК ні чым не дапамагало ЗРК у яго гаспадарчых мерапрыемствах. У той час, калі плошча пасеву ЗРК складае больш 30 проц. плошчы ўсіх пасеваў БЦРК, нават ня было аказана агранамічнай дапамогі яны наяўнасьці 15 аграномаў, якія ўдзельнічалі ў правядзеньні сяўбы на гаспадарцы БЦРК.

Партыйная ячэйка ЗРК правяла вялікую работу па будаўніцтве фэрмы, па мабілізацыі збору сродкаў на гэтае будаўніцтва, у рэзультаце чаго кантрольная лічба выканана больш як на 200 проц. Посьпехі будаўніцтва былі забясьпечаны работай па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў фабрыкі і прыцягненьні шырокіх мас рабочых да вырашэньня праблемы грамадзкага харчаваньня.

Аднак, справа не даведзена да канца. Ініцыятыўная работа партячэйкі ЗРК наткнулася на рад перашкод, на бюракратычныя адносіны кіруючых каапэрацыйных органаў. У мінулым годзе на фабрыцы закладзен фундамант пабудовы новай сталоўкі з разьлікам яе пракупскной здольнасьці—4.000 абедаў. Паводле плянаў, сталоўка павінна была быць пабудавана ў канцы году, але... фундамант зарос травой і на что да сёнешняга дня ні паложана ніводнай цягліны. А на справе што мы маем у справе грамадзкага харчаваньня на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна? Характарызуючы адным словам—агідная сьцьва. На фабрыцы маленькая сталоўка, якая працуе з адну вымену толькі 150 абедаў. У сталоўцы штодзённа вялікія чаргі, мітусьня, бруд. Якасьць абедаў ніколькі не палепшана. Галавацяны з праўленьня Белкаапсаюзу ўзялі курс... на «стандартызацыю» абедаў. Яны на 2-3 месяцы замест разнастайных круп дасылаюць толькі адзін гарох, а потым у наступныя месяцы—толькі якія-небудзь адны крупы. На фабрыцы арганізавана дыэтычная сталоўка з разьлікам для абслугоўваньня 80 рабочых. Хадайнічаньне кіраўніцтва фабрыкі аб уключэньні дыэтычнай сталоўкі ў плян забесьпячэньня застаецца без вынікаў.

Работа ЗРК «Чырвоная Бярэзіна» можа быць палепшана пры ўмовах рашучай барацьбы в бюракратычнымі адносінамі вышэйшых каапэрацыйных органаў, і ў першую чаргу, кіраўніцтва Белкаапсаюзу да выкананьня дырэктыў партыі аб паляпшэньні рабочага забесьпячэньня.

А.

Больш увагі рабоце ЗРК

Па прадпрыемствах Менску арганізавана ўжо ня мала закрытых рабочых каапэратываў. Гэта мерапрыемства за параўнаўча кароткі тэрмін дало значную эфэктыўнасьць у справе паляпшэньня рабочага забесьпячэньня. Так, напрыклад, ЗРК пры заводах «Камунар» і імя Варашылава перавыканалі свой гандальфінплян. Рабочым ужо ня прыходзіцца, як раней, шмат траціць часу на стаяньне ў чарзе.

Але ўсё-ж такі дасягнутая эфэктыўнасьць у гэтых ЗРК можа быць павялічана ў некалькі раз пры ўмове пераводу каапэртываў на гаспадарчы разрахунак, пры ўмове ўвядзеньня ў іх прэміяльна-зьдзельнай аплаты работнікаў прылаўку і г. д.

А гэтага як-раз у ЗРК «Камунара» і заводу імя Варашылава няма, у варплане гэтых каапэратываў яшчэ да гэтага часу пануе ўраўнілаўка. Гандфінплян на трэці квартал яшчэ не распраціцаван. Усё гэта зьяўляецца вынікам таго, што бюро парткалектыву гэтых заводаў недаацэньваюць усёй важнасьці перабудовы работы каапэрацыі. Гэтымі парткалектывамі ня толькі ня выкаканы дырэктывы аб арганізацыі парт'ячэек пры ЗРК, але нават не прадугледжана ініцыятыва ў справе ўзмацненьня іх партсіламі. У ЗРК заводу «Камунар» працуе толькі адзін камуніст.

Кіруючыя органы парткалектываў «Камунару» і заводу імя Варашылава павінны аддавець належную ўвагу рабоце ЗРК, узмацніўшы іх партсіламі.

С. Т.

СЁНЬНЯ ВУЗКАЕ МЕСЦА— СЬВІДРОУКА

Ад мэханічнага цэху залежыць канчатковы ўдар па прарыве

МАЙСТАР ГАРАНІН ЗРЫВАЕ АДГРУЗКУ ЎБОРАЧНЫХ МАШЫН

ГОМСЕЛЬМАШ, 20 ліпеня.

Мэханічны цэх, гэты галоўны нэрв Сельмашу, і да сённяшняга дня ня можа выблытацца з цянётаў сваіх зжаранелых няўправак і непаладкаў. Сумесная вытворчая нарада зборачнага і мэханічнага дэпа была вялікі штурмшок да знішчэньня гэтых непаладкаў. Мэханічны мае вялікія зрухі ў сэнсе больш поўнага забесьпячэньня зборшчыкаў дэталямі. АЛЕ МЭХАНІЧНЫ ПАДЫСЦІГНУЎ АДЗІН ТОЛЬКІ ВУЧАСТАК—ВУЧАСТАК ТАКАРНЫХ РАБОТ, ПАКІНУЎШЫ Ў ГЛЫБОКІМ ПРАРЫВЕ РАБОТУ ПА СЬВІДРОЎЦЫ.

Калі за апошнюю пяцідзеўку зборшчыкі атрымліваюць больш рэгулярна дэталі, якія залежаць ад мэханічнага, дык гэтыя дэталі зборшчыкамі або бракуюцца, або прыганяюцца, зьніжаючы прадукцыйнасьць работы больш як на 40 проц. Няма таго, каб уся прадукцыя мэханічнага цэлкам была скарыстана зборшчыкамі. З 54 адкідных ручаёк, паданых 19 ліпеня, 52 забракаваны, бо дзіркі прасьвідраваны малыя—ня подыдуць балты. Па няўпраўцы сьвідроўкі падана толькі 11 балек ходу замест 60, 3 грабкіні замест 30, 17 задніх восяй замест 35, 24 валы ніжняга вальца замест 30. Нікольні ня дана пярэдніх восяй, кулачкоў, ручак, зашчолкі і г. д. З кладовай мэханічнага цэху паданы 32 пакрышкі ўжо нават залітыя бэбітам, але НЕ ПРАСЬВІДРАВАНЫЯ. Сьвідроўка іншых дэталяй у большасьці няправільная.

Вось такія, здавалася-б дробязі, якія зусім лёгка паправіць, калі адчуць за гэта адказнасьць, штодня паўтараюцца на Сельмашы, штодня падрываюць сельмашаўскі прамфінплян.

За апошнюю пяцідзеўку Гомсельмашам выпушчана сіласарэзак: 16-га—23, 17-га—20, 18га—26, 19-га—30, 20—26. сячкарань: 16-га—2, 17-га—3, 18-га—3, 19-га—2, 20-га—2; бульбасартовак: з 16-га па 20-га выраблена 8; бульбамыяк—6.

Лічбы—мізэрныя. Праз мэханічны цэх праз гэты прарыў на фронце сьвідроўкі за адну толькі пяцідзеўку зборшчыкі маюць 279 ГАДЗІН ПРАСТОЮ.

Віна на мэханічны за зрыў выкананьня прамфінпляну падае ня толькі па сьвідроўцы і апрацоўцы дэталяй. Мэханічны ніяк ня можа выкарабкацца са сваіх унутры-цэхавых непаладкаў. Абслугоўваньне варштатаў значна нядбайнае. Рамонты і перашыўкі пасаў займаюць вялізарную колькасьць рабочага часу. ЗА ПЯЦІДНЕЎКУ ВАРШТАТЫ МЭХАНІЧНАГА МАЮЦЬ 104 ГАДЗІНЫ 20 МІН. ПРАСТОЯЎ. Горш за ўсё, што мэханічны ніяк ня можа прыстасавацца, каб перабой ў варштатах вывучаць і папярэджваць загадзя ў часе перапынкаў, а не рабіць гэта ў часе работы. ГЭТА НЕПАВАРОТЛІВАСЬЦЬ, ЗВЫЧКА ПРАЦАВАЦЬ З ХАЛАДКОМ НА ГОМСЕЛЬМАШЫ ПАВІННА БЫЦЬ ЗНІШЧАНА, бо самацёк і бездакназнасьць—лютыя ворагі бальшавіцкіх тэмпаў.

З халадком церпяцца на Гомсельмашы і такія зьявішчы, як прагулы. ЗА 4 ДНІ МЭХАНІЧНЫ МАЕ КАЛЯ 30 ГАДЗІН ПРАСТОЮ ВАРШТАТАЎ У ВЫНІКУ НЯВЫХАДУ НА РАБОТУ. У зборачным цэху нявыхад на работу складае 14 рабочых ДЗЁН. ПРЫЧЫНЫ НЯВЫХАДУ НЕ ВЫЛУЧАЮЦЦА, ЗАХАДАЎ ДА ІХ ЗНІШЧЭНЬНЯ няўжыта і гэты халадок яшчэ больш укараняе і рабочую бездакназнасьць і ўнутрыцэхавую разбэшчанасьць. Дзеолі сказаць, што 4 чалавекі—ЗЫСКІН, ГРЫЦКОЎ, БАРЭЙША, БАГДАНАЎ—у зборачны цэх не зьяўляюцца на работу па 10-12 дзён кожны, і ні адміністрацыя, ні заўком ня ведаюць — куды яны, ці аказаліся лятунамі і дзе-небудзь ужо спакойна пырхаюць па іншых заводах.

***

Тормазам у рабоце за апошні час зьяўляюцца перабої ў забесьпячэньні сырцом. Недахват некаторых асартымэнтаў жалеза на заводзе відаць было ўжо даўно і замест таго, каб загадзя пачаць шукаць выхаду, сельмашаўскія «рыцары спакою» — заводзкая адміністрацыя — спакойна чакалі, пакуль будзе скарыстаны ўвесь запас. І толькі тады, калі прарыў стаў падступаць да горла, пачалі замяняць адзін асартымэнт другім (як 35х5 на 40х8 у сіласарэзных кацёлах і інш.) у той час, калі гэта можна было зрабіць загадзя і папярэдзіць прарыў.

Двор і цэхі Сельмашу завалены сіласарэзкамі, якія ня могуць быць адпраўлены з-за адсутнасьці кацёл.

Але ці сапраўды няма кацёл?

У кавальскім цэху ляжыць каля 400 ШТУК абадоў і яны не рабіліся, бо «няма жалеза на сьпіцы». Яшчэ раней паступіла прапанова, каб замяніць канструкцыю сіласарэзных сьпіц — замест авальных падвойных — на простыя з загібам на заклёпку, што дало-б магчымасьць ужыць другі асартымэнт жалеза, які ёсьць на Сельмашы, і даць магчымасьць адгружаць сіласарэзкі, не пагоршваючы іх якасьці. Гэта прапанова прынята толькі ўчоры. Каб магчымасьці пратушчаны час, брыгада «Зьвязды» дагаварылася, што кавальскі цэх дасьць на заліўку ліцейнаму 70 штук кацёл. Каб сваячасова забясьпечыць кацёлсні зборшчыкаў, абрубшчыкі абяцалі выйсьці на работу раней на дзьве гадзіны, а зборшчыкі — у парадку грамадзкасьці пасьля рабочага дня — узяліся панадзявець гэтыя кацёлы на сіласарэзкі, каб работа па зборцы сіласарэзак магла ісьці рэгулярна.

Але начальнік кавальскага цэху ГАРАНІН да работы адносіцца з тым-жа самым халадком. За вытворчасьць, за заданьне, за завод не хварэе і ўпэўнена на слабе абавязку — падачы кацёл у ліцейны — ня выканаў.

Гомсельмаш знаходзіцца на шляху пералому. АД МЭХАНІЧНАГА ЦЭХУ ЗАЛЕЖЫЦЬ КАНЧАТКОВЫ ЎДАР ПА ПРАРЫВЕ. На ліквідацыю прарыву трэба мабілізаваць усе сілы.

Вызнная ўдарная брыгада «Зьвязды»: АРК. ЗАРУБЕЖНЫ, ДЗ. БОЙЧЫК, ЯН. СКРЫГАН.

МАШЫНЫ — УБОРАЧНАЙ

ВЫПУСК СІЛАСАРЭЗАК		
16 ЛІПЕНЯ	—	23
17 ЛІПЕНЯ	—	20
18 ЛІПЕНЯ	—	26
19 ЛІПЕНЯ	—	30
20 ЛІПЕНЯ	—	26

Рэзультат фашысцкай зямельнай рэформы

ВІЛЬНЯ, 22. Фашысцкая зямельная палітыка, якую ўрад праводзіць выключна ў інтарэсах памешчыкаў і куланкоў, даводзіць да жабрацтва значную частку бядняцкага і нават серадняцкага сялянства.

Працоўнае сялянства масава пазбаўляецца зямлі, сенажаці, прымусова перасяляецца на самыя горшыя землі. Усё гэта, зразумела, выклікае вялізарнае нездавальненьне працоўнага сялянства і даводзіць клясавую барацьбу ў вёсцы да нячуванай напружанасьці.

Нядаўна, як паведамляе віленскі фашысцкі друк, паміж селянамі і кулацтвам вёсак Вялікіх Заблоцьці і Малых Заблоцьці Дэраўніцкай гміны, выбухнула крывавая бойка. Бойка гэтая распачалася пры правядзеньні фашысцкай аграрнай рэформы, у рэзультаце якой уся лепшая сенажаць перашла ў рукі кулацтва.

Узброеныя сяляне і кулакі спаткаліся на лузе, дзе і разгралася надавычай жорстокая бойка, у часе якой было парэнена некалькі дзесяткаў асоб. На месца бойкі прыбыў вялікі атрад пешай і конкай паліцыі. Распачалася зьверская расправа. У ход была пушчана зброя і газавыя бомбы, у выніку чаго было парэнена некалькі сялян. У зьвязку з гэтым праведзены шматлікія арышты.

КРЫЗІС НЯМЕЦКАГА КАПІТАЛІЗМУ

«Пачалася нябывалых разьмераў гаспадарчая катастрофа. Крызіс, якому падобнага яшчэ ніколі ня было, награжае зьнішчэньнем гаспадаркі... (Нямеччына)...» — такімі словамі пачынаецца адозва ЦК КПП ад 15 ліпеня да працоўных Нямеччыны.

Гэтыя словы поўнасьцю адлюстроўваюць сытуацыю, якая стварылася ў Нямеччыне. Ужо ў пачатку чэрвеня нямецкая прадукцыя працавала з нагрузкаю ледзь ня поўных 50 проц. свае прадукцыйнай здольнасьці. Прадукцыя сталі вымешчалася на далейшыя 23,5 проц., жалеза — на 45 проц., акцыі ўпалі ніжэй самага нізкага ўзроўню ад студзеня бягучага году. Каля 20 мільярдаў марак, укладзеных у прамысловасьць у часе хістакай стабілізацыі, аказаліся ў сувязі з сучасным станам прадукцыі выкінутымі на вецер. Нямецкі экспарт у першай палове бягучага году ўпаў да 4,678 мільёнаў марак у параўнаньні з 6.206 мільёнаў марак у першай палове 1930 г.

Да гэтага крызісу, які з усёй сілай б'е па працоўных масах, далучаецца штораз больш нязносная ярмо версальскіх кандалоў і плянаў Юнга. Каля 3.500.000.000 марак штогод складаюць рэпарацыйныя плацяжы разам з процантамі за даўгі на пазыках заграничных, пры чым 1.553 мільёны прыпадае на плян Юнга.

Пры такіх умовах лічба беспрацоўных дасягнула паводле буржуазных даных да пачатку чэрвеня 4.766 тысяч, т. зн. на 50 проц. больш ў параўнаньні з мінулым годам, і з кожным днём усё больш павялічваецца.

Чацьверты падрад галодны дэкрэт Гінденбурга, новыя атакі фабрыкантаў маюць на мэце перакладзьці дасёньняшнія цяжары крызісу на плечы працоўных мас, вяцісяць з іх пот і кроў на выплату рэпарацыйных даўгоў, на латаньне дзір у бюджэце ўраду голаду, тэрору і забаўляньняў. Абурэньне шырокіх мас пралетарыяту, сялянства і дробнага мяшчанства ўзмацняецца з кожным днём. Нарастае гіганцкая барацьба пралетарыяту пад кіраўніцтвам КПН. Адбываюцца бязупынныя дэманстрацыі беспрацоўных, палітычныя забастоўкі супроць галоднага дэкрэту і ўраду Брюнінга. Хваляваньні ахопліваюць ніжэйшых дзяржаўных служачых. Гэта нарастаючая рэвалюцыйная хваля выклікала паніку як сярод нямецкіх капіталістаў, так і заграніччных, галоўным чынам амэрыканскіх, якія дрыжаць ад страху за свае капіталы, укладзеныя ў нямецкую прамысловасьць. Наступае трэцяя па ліку ўцечка капіталаў з Нямеччыны. На працягу 30 дзён заграніцу было вывезена звыш 1.750 мільёнаў марак. Да 17 ліпеня нямецкі банк страціў у дэвізах і золатам амаль 1.500 мільёнаў, што з усёй сілай ударае ў асновы нямецкай валюты.

1. ПЛЯН ГУВЭРА

Пры такой сытуацыі з адказам на зварот Гінденбурга аб дапамозе выступае Гувэра са сваёй пр

ДЭКАДНІК СКОНЧЫУСЯ, АГЛЯД ПРАЦЯГВАЦЬ

АПАЛ—РАБОЧЫМ ЦЭНТРАМ

ЛЕСБЕЛ безадказна адносіцца

ДА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ МЕНСКУ ДРОВАМІ

Лесбел нават ня ведае, колькі дроў прыбывае ў горад, ён не падрыхтаваў адпаведных умоў для работы пасланых у лес рабочых дружын.

Дзе карэньні прарываў

У загатоўцы дроў па Глускім леспрамгасе

ЦКК-НК РСІ абсьледавала ход месячніка загатовак дроў і лесу па Глускім і Нёманскім леспрамгасах. Глускі леспрамгас загатовіў 5 проц. праграмы месячніка (па дровах), вывёз 1,3 проц.; Нёманскі леспрамгас загатовіў 1,6 проц. праграмы і вывез 8,6 проц.

Кіраўніцтва гэтых леспрамгасаў ня справіліся з пастаўленымі перад імі задачамі, не мабілізавала апарат і бялянцка-серадняцкія масы вёскі на ўдарную работу па правядзеньні месячніка.

Наяўная рабгужсіла скарыстоўвалася амаль усьляпую, бо ні апарат леспрамгасу, ні сельсаветы не вялі ўліку нават у галіне выкананьня цьвёрдых заданьняў. Калі запатрабавалі гэтыя весткі ад Зенькаўскага вучастку, дык апошні высьветлял. сапраўднае становішча шляхам абходу двароў і апытаньняў у дандзькоў, хто і колькі раз выяжджаў.

А паколькі няма дакладнага і сыстэматычнага ўліку выкананьня, дык няма і адпаведнага рэгаваньня.

Неабходна патрабаваць ад леспрамгасаў, каб яны наладзілі сыстэматычны ўлік выкананьня заданьня па сэктарох, асабліва штодзенны ўлік выкананьня цьвёрдых заданьняў.

У разьмеркаваньні рабгужсілы паміж лесазагатоўкамі і дарожным будаўніцтвам пануе поўны хаос. Паасобныя сельсаветы па некалькі раз пераключаюцца з воскі лесу на вывяз каменьня, іх тузаюць адначасовымі даручэньнямі, што паралізуе рацыянальнае скарыстаньне гужсілы.

Агрэмаджаны сэктар амаль зусім ня прымае ўдзелу ў вывазцы, спасылаючыся на такія «прычыны», як набліжэньне ўборкі, суцэльная калектывізацыя. Апарат Нёманскага леспрамгасу замест правядзеньня адпаведнай работы сярод калгасьнікаў займаецца самастрахоўкай, адбіраючы ад калгасаў даведкі аб немагчымасьці ваяць дзе.

Цьвёрдыя заданьні выконваюцца вельмі дрэнна. Напрыклад, па Рудабельскім вучастку, Глускага леспрамгасу, цьвёрдыя заданьні выкананы на 0,3 проц., прычым на аднаго каня давалася 11-12 кбм. — роўна, як і на калгасьніка, у той час, калі агульная сярэдняя лічба заданьня месячніка складае на 1 каня 50 кбм. Па Зенькаўскім сельсавеце цьвёрдае заданьне выканана на 7,5 проц., у адносінах кулацка-заможных гаспадарак ужыта поўная ўраўнілаўка — па 25 кбм. наогул на сялянскі двор.

Уласны транспарт леспрамгасу нагружан толькі напалову. Нявыхад на работу складае па Нёманскім леспрамгасе каля 50 проц. Асноўная артэрыя гэтага леспрамгасу — вузкакалейная ветка, якая-б магла перавозіць каля 1.500 кбм. у суткі, увесь час давала ня больш 150 кбм. з прычыны нядбайных адносін да яе з боку леспрамгасу і Лесбелу. Аб мэханізацыі работы ніхто і ня думае. У Глускім леспрамгасе будуецца лежнявая дарога для вывазкі дроў, але тэмпы будаўніцтва такія павольныя, што ў гэтым годзе дарогай наўрад ці прыдзецца карыстацца.

Брыгадны мэтад работы на загатоўках ня ўжываецца. Забесьпячэньне лесараспрацовак прадуктамі і прамтаварамі за апошні час значна пагоршылася. Лясная каапэрацыя ўсё яшчэ неарганізавала ся. Ніякай культурнай работы сярод лесарубаў не вядзецца.

Раённае кіраўніцтва надзвычай мала ўвагі аддае месячніку і не аказвае амаль ніякай рэальнай дапамогі, абмежаваўшыся агульнымі дырэктывамі. 9 ліпеня былі мабілізаваны 50 адказных работнікаў Глускага РК і РВК, упаўнаважаных па правядзеньні калектывізацыі, уборкі, мабілізацыі сродкаў і дарожнага будаўніцтва, але ні словам не заікнуліся аб месячніку лесазагатовак. На запытаньне, чаму ні разу ня ставілася справаздача леспрамгасу, сакратар РК Дзяніскевіч і ч. в. а. старшыні РВК Кірыленка адказалі, што «мы такія ганебныя лічбы лічылі непатрэбным слухаць і вуона папярэдзілі дырэктара леспрамгасу».

Трэба працягнуць месячнік да 1 жніўня, вызначыць спэцыяльных упаўнаважаных РК і РВК у найбольш небясьпечныя вучасткі, мабілізаваць калгасьнікаў на ліквідацыю прарыву, хутчэй скончыць пабудову лежнявых дарог і, нарэшце, рашуча і безьлітасна ўдарыць па праўдзеньных праваапартуністычнага самацёку.

Я. КРАСОЎСКІ.

Да 15 жніўня пабудаваць 120 клм. лежнявых дарог

Нарада прадстаўнікоў леспрамгасаў, якая нядаўна адбылася пры Лесбеле, абгаварыла пытаньне аб пабудове драўляна-лежнявых дарог для вывазкі дроў і песаматар'ялаў. Нарада канстатавала, што пабудова дарог зацягваецца. Большасьць леспрамгасаў ігнаруе гэту справу, ня гледзячы на распараджэньне трэсту Лесбелу і партыйна-савецкіх арганізацый.

Барысаўскі леспрамгас даручыў пабудову лежнявой дарогі тэхніку СЬЦЯПАНАВУ, які на працягу месяца толькі два разы пабываў на месцы пабудовы. Намесьнікі дырэктара Барысаўскага леспрамгасу т.т. Зданоўскі і Робак, зусім ня цікавячыся ходам будаўніцтва дарог, у той-жа час апушчалі Лесбел, паведамляючы, што пабудова лежнявых дарог ідзе з посьпехам. Намесьнік дырэктара Чэрвеньскага леспрамгасу тав. СТАРОБІНЕЦ ня толькі не дапамагаў пабудове дарог, але тармазіў гэту работу. Чэрвеньскі леспрамгас таксама не дапамагаў будаўніцтву.

Асіпавіцкі леспрамгас зусім ігнаруе гэту справу. На пабудове быў адзін дзесятнік і то яго перакінулі на іншую работу, ня гледзячы на пратэсты начальніка будаўніцтва.

Загадчык Броскага вучастку Глускага леспрамгасу ВАЙКБЭРГ не забясьпечвае рабочых будаўніцтва прадуктамі, прамтаварамі, затрымлівае выплату грошай рабочым.

Наогул, большасьць леспрамгасаў ня лічыць пабудову дарог сваёй справай і ўзвальвае ўсю работу на начальніка будаўніцтваў і брыгадзіраў Лесбелу і Саюзлеспраму.

Нарада пастанавіла правесьці з 25 VII двухдэкаднік штурму прарываў у будаўніцтве лежнявых дарог, на працягу якога павінна быць скончана пабудова 120 клм. дарогі. Глускі, Чэрыкаўскі, Хойніцкі, Асіпавіцкі і Чэрвеньскі леспрамгасы ўступілі паміж сабою ў сацспаборніцтва на скарачэньне тэрміну пабудовы дарог, на зьніжэньне сабекошту і разгортваньне брыгадных мэтадаў работы.

Нарада патрабавала, каб усе мясцовыя арганізацыі непасрэдна дапамагалі забесьпячэньню пабудовы рабсілай, прадуктамі і прамтаварамі.

Завоз дроў у Менск

НАВОДЛЕ ДАНЫХ МЦРК ЗА 19 ЛІПЕНЯ ПАСТУПІЛА НА АДРАС ДРЫВЯНОГА СКЛАДУ МЦРК 12 ВАГОНАЎ, 20 ЛІПЕНЯ — 11, 21-ГА, — 12, 22-ГА— 1 ВАГОН, 23-ГА — 9. ЗА ЛІПЕНЬ ПАВІННА БЫЛО ПАСТУПІЦЬ 1.185 ВАГОНАЎ, АБО 37 ВАГОНАЎ У ДЗЕНЬ У СЯРЭДНІМ. ЗА ДРУГІ КВАРТАЛ ЛЕСБЕЛ НЕДАГРУЗІЎ МЦРК 52 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

У Парычах не прызнаюць рабочага кантролю

ПАРЫЧЫ. Нядаўна да старшыні Парычскага райвыканкому тав. Дашко зьявіліся па справах месячніка загатовак і вывазкі лесаматар'ялаў брыгадзір Менскага гарсавету тав. Ярашэвіч і прадстаўнік Глускага леспрамгасу тав. Мастовіч. Калі тав. Ярашэвіч, прадкінуўшы свае дакументы, запытаўся ў тав. Дашко, як ідзе месячнік лесазагатовак, старшыня РВК адказаў: «Вы ня маеце права мяне кантраляваць».

Калі-ж прадстаўнік леспрамгасу тав. Мастовіч аб тым-жа хацеў запытацца ў тав. Дашко, дык апошні заявіў: «Я з вамі аб гэтым зусім не хачу гаварыць».

Адносіны т. Дашко да загатовак дроў сьведчаць аб лупным ігнараваньні ім важнейшай справы.

У Жыткавічах месячнік сарван

ЖЫТКАВІЧЫ. (Наш кар.). Жыткавіцкія арганізацыі ніякага ўдзелу ня прымаюць у правядзеньні месячніка. Загатоўлена менш 3 проц. патрэбнай колькасьці дроў, вывезена калі 4 проц. Раённыя арганізацыі ня цікавяцца ходам месячніка, поўнасьцю пераключыўшыся на іншую работу. Гэта сьведчыць аб няўменьні злучаць кампаніі на шкоду аб паўменьні тэорыі «чарговасьці кампаній». Трэба прымусіць вінаватых работнікаў па-бальшавіцку узяцца за работу.

Танхілевіч.

Ад'езд рабочых брыгад на загатоўкі дроў

Паводле даных Лесбелу, да 19 ліпеня выехалі з Менску на лесазагатоўкі рабочыя дружыны ў складзе 1.051 чал. і рабочыя брыгады ў колькасьці 70 чал. Найбольшы лік дружыньнікаў паслала Кастрычніцкае аб'яднаньне заводу «Дзяржмашбуд»—165 чал. і гуты «Пралетары»—160 чалавек.

Рабочыя брыгады пасланы ў прадпрыемствамі.

Лічба восьтая, якія атрыманы з Менску, рабочыя дружыны прыступілі ўжо непасрэдных заняткам лесаматар'ялаў і дроў.

Каапэрацыя марудна і нездавальняюча рэалізуе адозву СНК і ЦК

ЗАМЕСТ 145 НОВЫХ МАГАЗЫНАЎ АДКРЫТЫ ТОЛЬКІ 2

ПРАДОЎЖЫЦЬ ДЭКАДУ АГЛЯДУ

Дэкаднік праверкі каапэрацыі паказвае, што разгортваньне спэцыялізаванай сеткі і адкрыцьцё новых магазынаў — самыя адсталыя вучасткі. У майскай адозве партыі і ўраду значнае месца адведзена паляпшэньню тэхнікі абслугоўваньня спажыўца. Каапэрацыі было прапанавана «ЎЖЫЦЬ УСЕ НЕАБХОДНЫЯ МЕРЫ ДА ТАГО, КАБ ДА ВОСЕНІ БЯГУЧАГА ГОДУ БЫЛІ АДКРЫТЫ НОВЫЯ МАГАЗЫНЫ ПРАДМЕТАЎ ХАРЧАВАНЬНЯ(хлеб, мяса, птушка, рыба, гародніна, малочныя прадукты фрукты)».

Па Беларусі павінна быць адкрыта 145 новых магазынаў. Гэта дырэктыва партыі НЯ ВЫКАНАНА. Чаргі па-ранейшаму ёсьць ня толькі ў магазынах адкрытага тыпу але і ў закрытых рабочых разьмеркавальніках. Асабліва вялікія чаргі ў прадуктовых і гародных крамах.

Белкаапсаюз, галінныя аб'яднаньні, ЦРК амаль НІЧОГА ПРАКТЫЧНАГА НЕ ЗРАБІЛІ для адкрыцьця новых магазынаў, ларкоў і ліквідацыі чаргі. Фактычна адкрыты ўсяго ДВА магазыны ў Менску. У некаторых гарадох, як Ворша, па віне гарсавету сетка ЗГОРТВАЕЦЦА.

Яшчэ дагэтуль з-за вузка-дзяляцкіх спрэчак паміж аб'яднаньнямі і ЦРК ня скончана нават перадача і прыёмка спэцыялізаваных магазынаў. Аб'яднаньні імкнуцца атрымаць магазыны, якія знаходзяцца ў цэнтры гораду і добра абсталяваны. Гомельскі ЦРК са свайго боку вылучыў для галінных аб'яднаньняў не магазыны, а падвалы і хлявы. У некаторых галінных аб'яднаньнях на пытаньне, як разгортваецца сетка, адказваюць: «Нам няма часу, мы заняты прыёмкай», а паасобныя аб'яднаньні ЦРК проста займаюцца «очковтирательством». Так, Малочна-масьлянае аб'яднаньне паведаміла ў Белкаапсаюз, што ім адкрыта 5 новых магазынаў, а Плодагароднае аб'яднаньне — 4, фактычна-ж ні аднаго новага магазыну імі не адкрыта. Гэтыя 9 магазынаў былі перададзены ЦРК спэцыялізаванай сеткі.

Грубейшыя недахопы ў рабоце каапэрацыі дапаўняюцца яшчэ наступным арыгінальным зьявішчам. Кіраўніцтва Белкаапсаюзу ў справе разгортваньня гандлёвай сеткі праяўляе поўную бездапаможнасьць. Старшыня праўленьня Белкаапсаюзу тав. ХАСКІН і член праўленьня тав СТРАКОЎСКІ на пытаньні: колькі-ж магазынаў усё-ж такі адкрыта? Другія работнікі заяўляюць, што «вестак з месц няма, бо машыністка не перадручала адносіну ў ЦРК». Кідаецца ў вочы адрыў Белкаапсаюзу ад сваёй прыярхы і поўная абязьлічка ў працы раду работнікаў. Тав. КУМКЕС, старшыня Менскага ЦРК, заяўляе, што фармальна пашырэньне сеткі яго не датычыць, бо Белкаапсаюз у сваіх плянах гэтага не прадугледзіў. Белкаапсаюз і МЦРК знаходзяцца ў адным будынку і чамусьці на працягу доўгага часу гэтыя арганізацыі не змаглі дагаварыцца.

Так працаваць далей нельга. Усякія спасыланьні каапэратараў на «аб'ектыўныя прычыны» — на адсутнасьць памяшканьняў, недахват тавараў — павінны сустракаць самы рашучы адпор. Гародніны ў Беларусі колькі хочаш, а патрабаваньні спажыўцоў не задавальняюцца. Да загатовак фруктаў таксама ня рыхтуюцца.

Плян разгортваньня гандлёвай сеткі пад пагрозай. Трэба ў бліжэйшыя-ж дні скончыць перадачу і прыёмку магазынаў і энэргічна ўзяцца за адкрыцьцё новых крам. Невыкананьне гэтага павінна разглядацца, як апартунізм на практыцы і парушэньне важнейшай дырэктывы партыі.

Партыйныя, прафэсыянальныя арганізацыі, гарсаветы, уся рабочая грамадзкасьць павінны ўзяць пад свой штодзенны непасрэдны кантроль усю работу Белкаапсаюзу галінных аб'яднаньняў і ЦРК, у прыватнасьці разгортваньне крамнай сеткі.

Пабудова заквасачнага пункту МЦРК.

Абязьлічка, бясплянавасьць і самацёк у барысаўскім ЦРК

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону).

Барысаўскі ЦРК да гэтага часу яшчэ не перабудаваў сваёй работы ў адпаведнасьці з гістарычнай адозвай партыі і ўраду. Часткова работа ЦРК нават пагоршылася. У кіраўніцтве пануе абязьлічка. Тавары разьмяркоўваюцца па закрытых разьмеркавальніках і крамнай сеткі не рэгулярна і неплянава. Пераважнае забесьпячэньне ўдарнікаў не наладжана. Асабліва дрэнна пастаўлена забесьпячэньне хлебам. Ёсьць усе магчымасьці зьнішчыць чаргі ў хлебных крамах шляхам павялічэньня сеткі, але ЦРК у гэтым напрамку нічога ня робіць. Пункт адозвы аб пераглядзе форм зарплаты работнікаў каапэрацыі не рэалізаваны. Праўленьне ЦРК не аказвае ніякай дапамогі новаарганізаваным рабкопам.

Аргюро сэкцыі грамадзкага харчаваньня вылучана праўленьнем ЦРК у першай палове чэрвеня, але фактычна да работы яно ня прыступіла. Усё чакае дырэктыў з цэнтру. Разьмеркаваньне прадуктаў па сталоўках і буфэтах праходзіць неплянава. Адміністрацыя заводаў не аказвае дапамогі ў паляпшэньні пастаноўкі грамадзкага харчаваньня.

Становішча з праполкай на гародах прыгарадной гаспадаркі ЦРК пагражаючае. 21 і 22 ліпеня на полі ня было ніводнага чалавека. Райпрафсавет бязьдзейнічае. Дагавары на аказаньне прыгараднай гаспадарцы дапамогі рабсілай ня выконваецца.

Лесарабкон, як самастоятная адзінка, пачаў працаваць з ліпеня. Ніякай дапамогі з боку ЦРК і райсаюзу ён не атрымлівае. Забесьпячэньне лесарабкону прадуктамі і прамтаварамі пастаўлена дрэнна. Райсаюз да гэтага часу не пералаў лясной каапэрацыі вызначаных фондаў. Белкаапсаюз са свайго боку таксама нядбайна адносіцца да выкананьня плянаў забесьпячэньня лесарабкону. Толькі 16 ліпеня апошні атрымаў першы парад на тавары, і то ня поўнасьцю. Уся работа праходзіць самацёкам, грамадзкія арганізацыі не дапамагаюць. Не раз лесарабкон паведамляў Белкаапсаюзу аб сваім становішчы, але ніякіх вынікаў.

Бярэзінскі рабкоп, абмеркаваўшы адозву партыі і ўраду, абмежаваўся прапяднем сходу, на якім замест 2 тыс. найпчыкаў, прысутнічала 200. Праўленьне рабкопу толькі цяпер заняліся складаньнем плянаў патрэбнасьці ў гародніне. Сярод работнікаў рабкопу зусім не разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Сталоўка пры **ст. Барысаў** да гэтага часу не перайшла на гаспадарчы разрахунак, у рабоце яе таксама няма плянавасьці. Да гэтага часу ня вызначаны нормы выпрацоўкі кожнага работніка сталоўкі. Унутранага распарадку няма. У сталоўцы абязьлічка, ніхто пэрсанальна не нясе адказнасьці за работу. За першы квартал бой начыньня склаў суму ў 400 руб. Санітарнае становішча сталоўкі дрэннае. Абеды падаюцца ў брудным начыньні. Работа сталоўкі патрабуе безадкладнага аздараўленьня.

Барысаў—буйны прамысловы цэнтр. Зусім зразумела, што мясцовыя партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі павінны былі аддаць максымум увагі цэху забесьпячэньня.

Раённыя кіруючыя арганізацыі павінны безадкладна выправіць буйнейшыя недахопы ў рабоце Барысаўскай спажыўкаапэрацыі.

Брыгада «Зьвязды», ЦСПСБ, Белкаапсаюзу, «Бальшавіка Барысаўшчыны» і райпрафсавету:

Зелябіс, Лаўроў, Сарокін, Дзятко, Скрэйкер, Абазаўс, Кішкурна, Шэйгін, Марцынкевіч, Іваноў, Талаеў, Бакштэйн, Фішына, Іраноэр, Страмноўскі, Серабін, Імінаў, Ручкова, Салавей, Родкіна, Пуміна, Гапытка, Моніч, Андрэеў, Майненсон, Кайзбар, Лодух, Элькінд, Тадарэцкі, Рагановіч, Сумчэнка, Камісараў, Аксёмаў, Мінкін, Рубін, Хадасэвіч, Садоўскі, Зайцаў, Пранін, Чаневіч, Ліпай, Вараб'ёў, Прапетаў, Кузьняцова, Некрашэвіч, Сабаленка, Кпебанаў.

На 4.000 рабочых... і магазын

ВІЦЕБСК. Галінныя аб'яднаньні і ЦРК ігнаруюць дырэктыву партыі аб пашырэньні крамнай сеткі. Замест 37 спэцыялізаваных магазынаў не адкрыта ніводнага ЦРК ня выканаў абяцаньня аб адкрыцьці 14 гародных ларкоў. Нічога ня робіцца для ліквідацыі чаргі. Невялікі магазін ЗРК панчошнай фабрыкі абслугоўвае 4 тыс. чалавек, што выклікае вялікія чаргі. Толькі вайсковы ЗРК паказвае прыклад, як трэба абслугоўваць спажыўца. Шляхам рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і, голоўным чынам, увядзеньне спэцыяльнай карткі для кожнага найпчыка магазыну № 100 вайсковага ЗРК удалося канчаткова дабіцца ліквідацыі чаргі.

Брыгада «Зьвязды», ЦСПСБ, Белкаапсаюзу і гарпрафсавету:

Штутнам, Шаршнёў, Муха, Серыкаў, Дуднёў, Смолікава, Кліноўская.

ПАПЕРУ—КРАІНЕ

ПАГРУЗАЧНАЯ ПАГЛЫБЛЯЕ ПРАРЫВЫ

ГАСПАДАРЧАЕ КІРАЎНІЦТВА ПАГРУЗАЧНАЙ НЯЗДОЛЬНА ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ БЕСЬПЕРАБОЙНУЮ ДАСТАЎКУ ТОРФУ НА ФАБРЫКУ „ГЭРОЙ ПРАЦЫ"

ПАГРУЗАЧНАЯ ПАВІННА АТРЫМАЦЬ НОВЫ ПАРАВОЗ І ПАТРЭБНЫ РАЗЬМЕР РЭЕК

Моцна ўдарыць па ўраўнілаўцы і ігнараваньні пытаньняў культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых. Партарганізацыя павінна па-бальшавіцку ўзяцца за рэалізацыю баявых задач, паказаных у апошняй прамове т. Сталіна

НАЧНЫ РЭЙД БРЫГАД „ЗЬВЯЗДЫ", „ПАЛЕСКАЙ ПРАЎДЫ" І „ЧЫРВОНАЙ БРАКАМОЛКІ"

19 ліпеня выязная брыгада «Зьвязды» разам з брыгадаю «Палескай праўды», і «Чырвонай бракамолкі» арганізавала начны рэйд на пагрузачную станцыю, якая падае торф для новай сілавой фабрыкі «Гэрой працы».

Як ужо паведамлялася, несваячасовая падача торфу пагрузачнай зьяўляецца адной з асноўных прычын прарыву на фабрыцы. Дрэнная работа пагрузачнай станцыі асабліва дала сябе адчуваць у апошнія дні, калі на фабрыцы ўжо заўважыўся пералом, але тэмпы забесьпячэньня торфам зрывалі работу.

19 ліпеня, з прычыны папсаваньня паравоза, пагрузачная на працягу сутак не падавала торфу фабрыцы. Кіраўніцтва не праявіла належнай гібкасьці, каб арганізаваць падвозку ваганэтак уручную і на конях.

Псаваньне паравозаў бывае надзвычай часта. Па гэтай прычыне, напрыклад, быў прастой машын фабрыкі (бо не падаваўся торф) і 16 ліпеня. Зусім відавочна, што адзін старэнькі паравоз ня можа забясьпечыць нармальную працу пагрузачнай станцыі. Патрэбны неадкладныя меры для здабычы другога спраўнага паравоза. Між тым ніякіх мер у гэтым напрамку ня ўжыта.

Рэйд выявіў факты простага злачынства. Торфазавод злучан рэйкамі з пагрузачнай, куды перавозіцца торф. Ня трэба быць вялікім спэцыялістам, каб зразумець, што рэйкі гэтыя павінны быць аднолькавай шырыні. Між тым, як выявілася, адна рэйка шырэй за другую на неаколькі м. м. Справа гэта патрабуе неадкладнага ўмяшаньня сьледчых органаў.

На самай пагрузачнай укладка рэек праведзена так, што ўвосень, калі пачнуцца дажджы, рэйкі будуць затоплены. Аб гэтым на фабрыцы ніхто не задумваўся, хоць увосень, з прычыны дрэннай укладкі рэек, можа быць спынена дастаўка торфу.

Брыгады друку наткнуліся на зусім недапушчальнае становішча абслугоўваньня і забесьпячэньня рабочых.

Паводле плану на 1 жніўня на пагрузачнай павінен быць пабудован будынак для зімовых кватэр рабочых. Работа гэта толькі пачалася, закладзен толькі фундамант і зусім зразумела, што ў тэрмін ён ня будзе пабудаваны.

Умывальнікаў на пагрузачнай няма, баракі, у якіх жывуць рабочыя, знаходзяцца ў антысэнітарным стане. Сьпіхнікоў няма.

Калі да гэтага дадаць, што на пагрузачнай вялікая цякучасьць рабочых, што расцэнкі ня выходзяць з колькасьці і якасьці зробленай працы, а бяруцца са столі, што няма правільнай расстаноўкі рабочай сілы (1 табэльшчык, напрыклад, толькі тым і займаецца, што падлічвае, колькі чалавек абедае, сьпедае і вячэрае), дык стане зразумелым тое вялікае значэньне, якое мае канкрэтная рэалізацыя тых баявых задач, якія вызначаны ў прамове правадыра партыі тав. Сталіна. Аднак, да гэтага часу гэта справа на пагрузачнай не наладжана.

Культмасавая работа фактычна адсутнічае. Ударніцтва і сацспаборніцтва не разгорнуты. Побач з гэраічнай работай паасобных брыгад, як брыгады Барабанавай і Барсукова, ёсьць такія брыгады, як Гардзіенкі, якая павінна была працаваць на торфе ў начной зьмене, але замест гэтага спала. Рэйд 2 разы перашкаджаў... спаць гэтай гора - брыгадзе. Зусім відавочна, што слабая работа ўдарных брыгад, як і наогул слабае разгортваньне ўдарніцтва і спаборніцтва, тлумачыцца слабым кіраўніцтвам з боку мясцовых арганізацый. Партыйная арганізацыя, як высьветліла брыгада, недапушчальна дрэнна працуе. За ўвесь час існаваньня пагрузачнай быў праведзен усяго толькі адзін партсход, а на пагрузачнай ёсьць 8 партыйцаў і 9 камсамольцаў.

Удзельнікі рэйду, вызначыўшы фактычнае становішча на пагрузачнай, наладзілі суботнік па практычнай дапамозе ў ліквідацыі непаладжаў і выпусьцілі першы нумар насьценнай газэты па пагрузачнай.

Удзельнікі рэйду лічаць, што гаспадарчае кіраўніцтва на пагрузачнай павінна быць тэрмінова ўзмоцнена. Для ліквідацыі недахопаў трэба разгарнуць работу па мабілізацыі рабочых пагрузачнай, патрэбна дапамога ўсіх рабочых «Гэроя працы».

Удзельнікі аб'яднанага рэйду: Бапюнаў, Барабанава, Каліноўская, Стэрэнзон, Бобрыкаў, Вольны, Малашэнка, Лашкевіч, Воінаў, Броўка, Жывапісцаў, Хадзькова, Гаўрусёва, Фардман, Пятушкова, Ганчарова, Таўкачоў, Астапенка, Гарбуз, Манькоў, Папернік, Вішнеўскі, Даўгапольскі, Гутарава, Калугіна, Павепочка.

За мяжою

Забастовачная хваля нарастае

ВАРШАВА, 21. Забастовачная хваля ў фашысцкай Польшчы, якая ўзьнялася ў алказ на наступленьне капталістаў працягвае бесьперапынна нарастаць. Як паведамляе сацыял-фашысцкі «Роботнік», у тарноўскіх цагельнях «Тарнавянка», «Мяшчанка», «Констанцыя», а таксама ў цагельні Зомэра пачалася забастоўка. Рабочыя патрабуюць павялічэньня зарплаты, якую капталісты на працягу апошняга часу абрэзвалі некалькі разоў.

Такая самая забастоўка выбухнула ў Луцку ў цагельні Лінчука. Прычынаю забастоўкі зьяўляюцца сыстэматычнае невыплачваньне адміністрацыяй заработнай платы.

Нядаўна з прычыны затрыманьня на працягу двух месяцаў зарплаты абязьсілілі забастоўку рабочыя тартаку ў Камёнцы.

У Аранах выбухнула забастоўка рабочых, занятых на пабудове чыгункі. Забастоўка распачалася з прычыны 30 проц. зьніжэньня зарплаты, якое ўсюды праводзяць фашысцкія ўлады.

ВАРШАВА. 18. Становішча працоўных мас настолькі нагоршылася, што, згодна паведамленьня сацыял-фашысцкага «Роботніка», здараюцца шматлікія выпадкі, калі згаладнелыя людзі просяцца, каб іх пасадзілі ў турму. Тлумачаць гэта тым, што там яны будуць мець страху над галавой і лыжку стравы, чаго на свабодзе не заўсёды ўдаецца здабыць.

НАЛЁТ НА ДОМ ЦК КАМПАРТЫІ

БЭРЛІН, 21. Сёньня пасьля абеду паліцыя заняла дом ЦК нямецкай кампартыі. Зроблен пільны вобыск. Двое арыштавана, у тым ліку дэпутат Ляйдтагу Волиш. Паліцыя канфіскавала некалькі сот брашур і газэт. (ТАСС).

САЦЫЯЛ-ФАШЫСЦКАЯ АПАЗЫЦЫЯ — ЛЕПШЫ СРОДАК ПАДТРЫМАНЬНЯ КАПІТАЛУ

МАДРЫД. Орган гішпанскіх банкіраў «Фінансьеро» у адным з артыкулаў выказваецца, што ўдзел сацыялістаў ва ўрадзе шкодны, бо яны дзякуючы гэтаму працяць уплыў у масах. Сацыялісты павінны заставацца ў апазыцыі, тады сацыялістычная пазыцыя зможа лепш падтрымліваць рэспубліку. (ТАСС).

КРЫВАВАЯ РАСПРАВА З ЗАБАСТОЎШЧЫКАМІ Ў СЭВІЛЬЛІ

ПАРЫЖ. У Сэвільлі пачалі курсаваць трамваі, якія суправаджаюцца салдатамі і над аховай паліцыі. Стачачнікі нападалі на трамваі, але былі адбіты аховай. Паранена, паводле афіцыяльных даных, 15 чалавек, у большасьці выпадкаў цяжка. У сапраўднасьці лік параненых значна большы бо шмат параненых былі адпесены на свае кватэры. Арыштавана 130 чалавек. Зроблена шмат вобыскаў. (ТАСС).

БАЯВЫЯ СУТЫЧКІ СЭВІЛЬСКІХ РАБОЧЫХ З ЖАНДАРМЭРЫЯЙ

ПАРЫЖ. Агенцтва Гавас паведамляе падрабязнасьці аб сутычках паміж жандармэрыяй і стачачнікамі ў Сэвільлі. Забастоўшчыкі з дахаў і вакон суседніх дамоў стралялі ў жандараў, пасьля чаго прабавалі втакаваць паліцэйскія казармы, але былі адбіты. Былі прысланы атрады пяхоты, якія залпамі абстрэльвалі стачачнікаў. З васьмі параненых рабочых 4 цяжка паранены. (ТАСС).

КІТАЙСКІЯ ГЕНЭРАЛЫ РЫХТУЮЦЦА ДА НОВАЙ ГРЫЗЬНІ

ШАНХАЙ. Кантонская газэта «Кантон Дэйлі Сан» паведамляе, што вызначнейшыя паўночныя генэралы Хань фу-Цюй, Шы ю-Сян і Сун цзі-Юань паслалі Фын юй-Сяну тэлеграму, у якой просяць яго стаць на чале войск для нападу на Нанкін. Газэта паведамляе, што Фын юй-Сян кантакта абяцаў мабілізаваць свае войскі супроць Чан Кай-шы і часткольці загаду Кантона аб назначэньні яго на пост галоўнакамандуючага паўночна-заходнім войскам. (ТАСС).

Дэкада грамадзянскай авіяцыі

ВОПЫТ „РАБОЧЕГО" ПАДХАПІЦЬ УСЯМУ ДРУКУ БССР

За магутны грамадзянскі паветраны флёт

Грамадзянская авіяцыя ва ўмовах БССР мае выключнай важнасьці значэньне. БССР, не зьяўляючыся буйной тэрыторыяльнай адзінкай нашага Саюзу, ляжыць на шляху, які злучае СССР з капіталістычным Захадам. Грамадзянская авіяцыя зьяўляецца важнейшым сродкам зносін паміж СССР і Эўропай. Праз БССР праходзіць паветраная лінія Масква — Ленінград — Украіна.

Грамадзянская авіяцыя можа аказаць капітоўчыя паслугі нашай краіне, якая мае вялізарныя лясныя масывы, як сродак барацьбы са шкоднікамі лесу (жукараед і інш. чужаеды).

Выходзячы з гэтых умоў, Цэнтральны Савет Асавіяхіму БССР, у мэтах садзейнасьці разьвіцьцю грамадзянскай авіяцыі, як магутнаму фактару сацыялістычнага будаўніцтва абвясьціў дэкаднік грамадзянскай авіяцыі з 10 па 20 ліпеня.

Аднак, ня гледзячы на ўсю важнасьць грамадзянскай авіяцыі, многія грамадзкія арганізацыі недаацанілі значэньня дэкадніка і не прыклілі максымуму ўвагі гэтай справе, у выніку чаго дэкаднік ня даў належнага эфэкту і быў прадоўжан яшчэ на дзесяць дзён.

ЦС Асавіяхіму паставіў перад падпараджанымі яму арганізацыямі і наогул перад усёй савецкай грамадзкасьцю вялікія задачы па пабудове ў буйнейшых гарадох рэспублікі аэрадромаў, арганізацыі школ авіяцыі, пабудове ў гаворных раёне авіяпляцовак пад лёзунгам: «Кожны раён павінен мець самалёт», па шэфстве рабочых арганізацый над грамадзянскім будаўніцтвам, па зборы сродкаў на авіяцыю і г. д.

Разгорнутая кампанія ўжо дала дадатныя вынікі ня толькі ў сталіцы БССР — у Менску, але і ў іншых гарадох. Рабочыя віцебскіх заводаў «Чырвоны мэталіст» і «Кампітэры» прынялі шэфства над аэрадромам і школай лётнікаў у Віцебску. Пералічаныя заводы ўзялі на сябе абавязак пабудаваць ангар у Віцебску, на што ўжо ўнесьлі 5 тысяч рублёў. Гэтыя-ж заводы выклікалі пасьледаваць іх прыкладу Гомсельмаш, фабрыку «Сьцяг індустрыялізацыі» і Менскі «Камунар».

У Воршы і іншых гарадох разгарнулася кампанія па зборы сродкаў на грамадзянскае авіябудаўніцтва. Але наогул, кампанія праходзіць нездавальняюча па віне прафэсыянальных арганізацый, якія не скарысталі дэкадніка для шырокай папулярызацыі ідэй грамадзянскага авіябудаўніцтва сярод шырокіх мас рабочых на фабрыках і заводах. Слабы ўдзел у мабілізацыі сродкаў на гэту справу прымаюць гарсаветы і райвыканкомы.

Трэба час, які застаўся, скарыстаць для далейшай мабілізацыі сродкаў на авіябудаўніцтва шляхам правядзеньня суботнікаў у выхадныя дні, добраахвотных адлічэньняў і інш. Часу засталося ня многа, але яго хопіць на тое, каб на-ходу выправіць дапушчаныя памылкі і ліквідаваць некаторую пасыўнасьць паасобных грамадзкіх арганізацый; прафэсыянальным-жа арганізацыям трэба са ўсёй адказнасьцю выканаць пастанову ЦСПСБ ад 14 ліпеня. Трэба абстаяваць пасадачныя авіяпляцоўкі на раёнах, пабудаваць і абсталяваць аэрадромы ў гарадох і распачаць добраахвотны збор сродкаў на будаўніцтва новых дваяткаў грамадзянскіх самалётаў.

Трэба цьвёрда памятаць, што ўсе гэтыя задачы могуць быць выкананы толькі пры ўдзеле шырокіх мас працоўных гораду, калгасаў і саўгасаў, пры неаслабным бальшавіцкім кіраўніцтве і апэрацыйнасьці асавіяхімаўскіх і грамадзкіх арганізацый.

Толькі пры гэтых умовах мы створым магутную грамадзянскую авіацыю — капітоўчы ўклад у нашу сацыялістычную народную гаспадарку.

Дрылёнак.

Прыклад апэрацыйнасьці

Бурныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва і разгортваньне культурнай рэвалюцыі прад'яўляюць усё ўзрастаючыя запатрабаваньні да грамадзянскага паветранага флёту. Ня гледзячы на вялікія перамогі, дасягнутыя ў будаўніцтве грамадзянскай авіяцыі ў СССР, на гэтым вучастку мы маем сур'ёз

Год выданьня—XV
№ 198 (410)
ПЯТНІЦА, 24 ЛІПЕЯ 1931 г.
Цена нумара 5 кап.
выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27,)—сакратар—10-74, партсэкстар—13-60, прапысл.—13-80, сав. эканм.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-42, міжгародняй інфармацыі—10-74, канторавыд-ва—81, адрас абвестак—7-81

Позыка „3-ці рашаючы"

У ТЭРМІН

рэалізаваць пазыку на вёсцы

НІВОДНАГА КАЛГАСЬНІКА І АДНААСОБНІКА БЕЗ АБЛІГАЦЫІ

Трэці рашаючы год пяцігодкі зьяўляецца годам завяршэньня пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі ў краіне Саветаў. 518 новых фабрык і заводаў уваходзяць у строй, 1040 машына-трактарных станцый будуць працаваць на калгасных палёх.

Пасьпяховае выкананьне гэтых задач патрабуе максымальнай мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў працоўных Савецкага Саюзу. Краіна Саветаў ня можа спадзявацца на пазыкі з боку буржуазных краін.

Забясьпечыць грашовымі сродкамі выкананьне пляну вялікіх работ трэцяга рашаючага году пяцігодкі — гаварыць абазязак усіх працоўных гораду і вёскі.

Выпушчаная ўрадам па патрабаваньні перадавых атрадаў рабочай клясы і калгасьнікаў, пазыка «Трэці рашаючы год пяцігодкі» зьяўляецца магутным укладам у сацыялістычнае будаўніцтва. З агульнай сумы рэалізаванай пазыкі 30 проц. адлічваецца ў сельскі і 20 проц. у раённы бюджэты на мясцовыя патрэбы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва гораду і вёскі.

Рабочая кляса БССР з энтузіязмам су стрэла пастанову ўраду аб выпуску пазыкі і сапраўды ўдарнымі большавіцкімі тэмпамі правяла ў сябе падпіску, даўшы ў пазыку дзяржаве 25.150.000 руб., што складае 107,5 проц. заданьня па групе рабочых і служачых БССР.

Рэалізацыя пазыкі на вёсцы — другі важнейшы і адказьнейшы этап кампаніі. На прыкладзе гораду рэалізацыя на вёсцы павінна быць праведзена сапраўды нымі большавіцкімі тэмпамі пры самым шырокім і актыўным удзеле ўсёй грамадзкасьці як гораду, так і вёскі, асабліва пры актыўным удзеле як цэнтральнага, так і мясцовага друку.

Ударны дэкадник, які праводзіцца з 20 ліпеня, павінен завяршыць кампанію і забясьпечыць поўнае выкананьне заданьня па рэалізацыі пазыкі на вёсцы па БССР у суме 16 млн. руб.

Заданьне вельмі значнае, аднак, зусім рэальнае і павінна быць поўнасьцю выканана.

КАЛГАСЬНІКІ і ЎДАРНІКІ ПАЛЕЎ!

Не адставайце ад рабочых, пакажэце прыклад большавіцкіх тэмпаў у падпісцы на пазыку. Станьце арганізатарамі рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў—заўтрашніх калгасьнікаў, разгарнеце сацспаборніцтва, вылучце са свайго асяродзінча ўдарныя штурмавыя брыгады, арганізуйце грамадзкі буксір адстаючых, работу праводзьце пад лёзунгам «ніводнага калгасьніка і аднаасобніка, які-б не падпісаўся на пазыку ў разьмеры ня менш 3-хтыднёвага даходу».

РАБОЧЫЯ САЎГАСАЎ і МТС!

Становецеся ў перадавыя рады падпісчыкаў на пазыку і окажэце практычную дапамогу і ўплыў на рэалізацыю пазыкі сярод працоўнага сялянства.

КАЛЕКТЫВЫ РАБОЧЫХ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ!

Вы тады выканаеце поўнасьцю свае абавязкі перад дзяржавай, калі забясьпечыце пасьпяховую рэалізацыю пазыкі на вёсцы. Кожны завод, кожная фабрыка і ўстанова нясуць грамадзкую абказнасьць за рэалізацыю пазыкі ў падшэфным раёне, вёсцы і калгасе. Пасылайце ўдарныя брыгады рабочых, адпускайце і выходнікаў на дапамогу падшэфнай вёсцы. Перадайце вопыт вашай работы вёсцы!.

УДАРНІКІ-КАМСАМОЛЬЦЫ!

Вы, якія паказалі большавіцкія прыклады работы ў выкананьні дырэктыў партыі на важнейшых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, павінны стаць перадавікамі ў рэалізацыі пазыкі на вёсцы. Выканайце загад Цэнтральнага Камітэту Ленінскага Камсамолу—«кожны камсамолец павінен завербаваць ня менш 6-ці падпісчыкаў на аблігацыі пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі».

КАМІСІІ САДЗЕЙНАСЬЦІ ДЗЯРЖКРЭДЫТУ і АШЧАДНАЙ СПРАВЕ!

На вас урадам ускладзена адказьнейшая задача—рэалізаваць пазыку на вёсцы. Складзеце актыў вакол кампаніі, расстаўце свае сілы такім чынам, каб поўнасьцю забясьпечыць абслугоўваньне ўсіх вучасткаў рэалізацыі пазыкі. Арганізуйце і актывізуйце кадры грамадзкіх інструктароў, падцягвайце адстаючых, выяўляйце і прэміюйце лепшых актывістаў, якія праявілі сябе ў рэалізацыі пазыкі. Устанавеце неаслабны нагляд за паступленьнем грошай па падпісцы и за прасоўваньнем гэтых сродкаў ад пазыкатрымальнікаў да крэдытных устаноў. Арганізуйце шырокае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў. Давядзеце ў парадку цьвёрдых заданьняў пазыку да ўсіх кулацкіх гаспадарак і мэтадамі грамадзкага ўзьдзеяньня забясьпечце поўнае выкананьне гэтых заданьняў.

ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАЕ НАСТАЎНІЦТВА!

Вы, ударнікі культурнага фронту, павінны прыняць актыўны ўдзел у рэалізацыі пазыкі на вёсцы, вы павінны дапамагчы сваім актыўным удзелам і прыкладам вясковым арганізацыям правесьці шырокую растлумачальную работу аб пазыцы сярод калгасьнікаў і аднаасобнага бядняцка-серадняцкага сялянства. Зрабеце хаты-чытальні, клюбы, школы і іншыя культурныя ўстановы цэнтрам штодзённай агітацыйна-растлумачальнай работы аб дзяржпазыках, забясьпечце ўкараненьне ў шырокія працоўныя масы вёскі ідэй дзяржкрэдыту і ашчаднай справы.

РАБСЕЛЬВАЕНКОРЫ!

Мабілізуйце шырокія масы працоўнага сялянства на пасьпяховую рэалізацыю пазыкі на вёсцы, асьвятляйце ў друку лепшыя ўзорныя прыклады працы. Крытыкуйце недахопы, дабіваючыся іх зьнішчэньня, забясьпечце пасьпяховую рэалізацыю пазыкі на вёсцы.

ПРАЦАЎНІКІ ФІНАНСАВА-КРЭДЫТНАГА АПАРАТУ!

Арганізуйце выразнае і лепшае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў. Забясьпечце сваячасова ўсе арганізацыі агітацыйна-даведачнымі і апэрацыйнымі матар'яламі, а таксама аблігацыямі пазыкі. Арганізуйце практычную дапамогу сельсаветам, камісіям садзейнасьці, калгасам у пастаноўцы ўліку афармленьня падпіскі. Арганізуйце жывы інструктаж і дапамогу нізавым арганізацыям у правядзеньні кампаніі рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, разгортваньнем шырокай агітацыйна-растлумачальнай работы на ўмовах поўнай добраахвотнасьці, даючы рашучы адпор кулацкай агітацыі, падцягваючы шляхам грамадзкага буксіру адсталыя арганізацыі, практычнай дапамогай гарадзкіх пралетарскіх арганізацый —хутка і поўнасьцю рэалізуем пазыку «Трэці рашаючы год пяцігодкі» на вёсцы.

Актыўным удзелам усёй савецкай грамадзкасьці выканаем і перавыканаем заданьне па рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Народны Камісар Фінансаў БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

Аўганскія фэадалы і брытанскі імпэрыялізм

Абыходлівыя адносіны і падкрэсьленая ўвага, якія праяўляюцца брытанскім імпэрыялізмам да цэрсоны і палітыкі Надыр-шаха, зьяўляюцца фактам новыпадковым і сьведчаць аб блізасьці, што ўстанавілася паміж імпэрыялізмам і афганскімі фэадаламі.

Некаторы час таму назад рэдактар лагорскай газэты «Зэміндар» Саяд-Гулям-Русаім-шах выдаў лістоўку, у якой быў апублікаваны ліст былога аўганскага падышаха Аманулы з Італіі.

У гэтым лісьце Аманула абвінавачваў Надыр-шаха ў ашуканстве, здрадзе і процізаконных дзеяньнях.

На падставе «дэкрэту аб зьнешніх адносінах» лістоўка гэта была зараз-жа канфіскавана індыйскім урадам.

Таксама ня раз канфіскаваліся паасобныя нумары газэты «Зэміндар».

З пункту гледжаньня падтрыманьня, якое аказваецца брытанскім урадам Надыр-шаху, заслугоўвае ягоўвагі распараджэньне губэрнатара паўночна-заходняй (пагранічнай) правінцыі, які за гадаў канфіскаваць усю літаратуру, накіраваную супроць Надыр-шаха.

Ангельска-індыйская ўлада душыць усякую крытыку, накіраваную супроць Надыр-шаха, стараючыся, такім чынам, па-першае, «падзякаваць» яму за дапамогу, аказаную ім брытанскаму імпэрыялізму пры задушэньні паўстаньня афрыдаў, і, па-другое, імкнецца ўтаіць ад шырокіх мас той факт, што **Надыр-шах аб'ектыўна садзейнічае брытанскаму імпэрыялізму ў падрыхтоўцы вайны супроць Савецкага Саюзу.**

Ваенныя падрыхтаваньні Надыр-шаха характарызуюцца тэлеграмай агенцтва «Асошыэйтэд прэс», нядаўна апублікаванай у індыйскім друку.

«Аўганская армія,—гаворыцца ў гэтай тэлеграме,—якая нядаўна была грунтоўна выпрабавана, рэарганізавана пад асабістым наглядам караля Надыра, будзе цяпер нанава ўзброена навейшымі прыладамі вайны. У Пешавар з Францыі ў Кабул **прыбыло 10.000 дальнабойных французскіх вінтовак і 10 мільёнаў патронаў,** якія каштуюць звыш 70.000 фунт. стэрлінгаў... Зброя будзе перакінута ў Кабул па 240 грузавіках, з якіх 100 ужо знаходзяцца ў дарозе. Астатнія грузавікі павінны хутка выйсьці».

У паведамленьні агенцтва падкрэсьлівецца, што **«гэта самая буйная пастаўка зброі, калі-небудзь атрыманая Аўганістанам».**

Гэта пастаўка зьяўляецца адным з доказаў простага саюзу Надыр-шаха з заходня-эўрапэйскім імпэрыялізмам.

Як вядома, **ангельскі ўрад забясьпечвае Надыр-шаха грашовымі сродкамі для закупкі зброі і благасклонна дапускае транспартаваньне яе праз брытанскую Індыю.**

Той факт, што пастаўленая зброя—французскага вырабу, пішні раз сьведчыць аб узгодненых дзеяньнях брытанскага і французкага імпэрыялізмаў у падрыхтоўцы антысавецкай вайны.

Той факт, што **Аўганістан зьяўляецца важнейшым плацдармам для нападу на СССР** раскрывае істотны сэнс палітыкі імпэрыялістаў у адносінах Надыр-шаха.

РУЖ.

НАПЯРЭДАДНІ 1-га ЖНІЎНЯ

ў краінах капіталу

Заклік да баявых выступленьняў рабочай моладзі

ПАРЫЖ. Орган камсамолу Францыі **«Авангард»** апублікаваў адозву, у якой заклікае рабочую моладзь **выступіць 1 жніўня** на заводах і фабрыках **супроць імпэрыялістычнай вайны, супроць наступленьня капіталістаў на зарплату, супроць прасьледваньняў рэвалюцыйных рабочых і салдат.**

Адозва заклікае рабочую моладзь **выступіць у абарону Савецкага Саюзу, за вызваленьне зьняволеных рабочых і салдат,** у абарону органу саюзу моладзі «Авангард». Адозва прапануе **арганізаваць 1 жніўня забастоўкі,** мітынгі ля варот прадпрыемстваў і вулічныя дэманстрацыі, якія павінны зьявіцца **падрыхтоўкай да 17 міжнароднага юнацкага дня.** Да гэтага дня прызначана паездка ў СССР дэлегацыі рабочай моладзі.

«Юманітэ» паведамляе, што французкія імпэрыялісты вядуць новыя буйныя ваенныя дзеяньні, якія маюць мэтай пакарыць плямёны вялікага Атлясу. Апэрацыі пачаліся некалькі месяцаў таму назад супольнымі намаганьнямі пяхоты, танкаў і авіяцыі. «Уціхаміраньне раёнаў неабходна французкаму імпэрыялізму з тае прычыны, што непакорныя плямёны зьяўляюцца пагрозай для будучай французка-сахарскай чыгункі».

ВЕНА, 20. Як паведамляе сафійская газэта **«утро»,** у Софіі **стварыўся антываенны камітэт** з прадстаўнікоў ўсіх рэвалюцыйных рабочых і сялянскіх арганізацый і арганізацый рэвалюцыйнага студэнства. Мэта Камітэту — **падрыхтаваць антываенныя выступленьні да 1-га жніўня...** (Тасс)

БЭРЛІН. 20. Як паведамляюць з **Амстэрдаму,** арганізацыя галяндзкіх сялян выпусьціла адозву да працоўнага сялянства, запрашаючы яго **да масавых дэманстрацый 1-га жніўня разам з рабочымі, каб пратэставаць супроць падрыхтоўкі вайны і цкаваньня Савецкага Саюзу.**

Бэрнард Шоў прыехаў у СССР



НЕГАРЭЛАЕ, 22. (БЕЛТА). Гэтымі днямі прыехалі Бэрнард Шоу, Лядзі Астэр і лёрд Астэр, якія ставяць сваёй мэтай азнаёміцца з агульным становішчам СССР. У Негарэлым Шоў сустракаліпрадстаўнік «ОГПЗ» **Юнаў,** ад фэдэрацыі савецкіх пісьменьнікаў—**Гладкоў** і ад ПЕЗПТ — **Каган;** ад ангельска-амэрыканскага клюбу і газэты «Москаў Ньюс» **Луіза Стронг.**

Наколькі Шоў і лядзі Астэр цікавяцца становішчам СССР можна заўважыць з таго, што скарыстоўваючы стаянку цягніка, яны запрасілі Наркома Замежных Спраў — **тав. Літвінава,** які варочаўся з-за мяжы і пачаў агляд вёскі і пасёлку Негарэлае.. Варочаючыся да цягніку, убачылі групу жанчын-работніц, якія працавалі на чыгунцы. У гутарцы з імі задавалі розныя пытаньні: адкуль яны, як жывуць, колькі гадзін працуюць і г. д.

Гішпанія ў агні забастовак

МАДРЫД. У **Мэлільлі** (Гішпанскае Марока) **адбылася 60 тыс. дэманстрацыя бастуючых гарнякоў і чыгуначнікаў. У Сэвільлі** арыштавана 35 бастуючых тэлефаністаў. У **Лёрыдзе** арыштаваны забастовачны камітэт тэлефаністаў. Па сводках газэты «Эль-Соль», усе бастуючыя тэлефаністы ў **Віго** арыштаваны. Тэлефонныя правады перарэзаны ва многіх мясцох, у асаблівасьці ў **Сарагосе.** Забастовачны камітэт тэлефаністаў у Мадрыдзе апублікаваў адозву, накіраваную супроць амэрыканскай тэлефоннай кампаніі. З прычыны забастоўкі, якая ўсё яшчэ працягваецца на заводах **«Дуро Фельгэра»** ў **Овьедо,** урад паслаў туды войска з кулямётамі.

А. НЕКРАШЭВІЧ

ШКОЛЕ—ПАДРУЧНІКІ

Выхаваньне з новага пакаленьня адданых змагароў справе сацыялізму—адказьнейшая і актуальнейшая задача. Гэту задачу вырашае савецкая палітэхнічная школа. Аднак, было-б вялікай памылкай лічыць, што падручнік для гэтай школы ўжо непатрэбны. Наадварот, савецкая палітэхнічная школа прад'яўляе асабліва высокія запатрабаваньні да падручніка. Усім вядома і тое, што беларускі падручнік на працягу гадоў атручваўся прапагандай нацыянал-дэмакратычных ідэй, капіталістычнага напрамку разьвіцьця Савецкай Беларусі і іншым баластам «рыцараў» буржуазнай рэстаўрацыі.

У справе напісаньня падручніка адбывалася такое-ж вострае клясавае змаганьне, як і ў іншых галінах культурнага будаўніцтва. Рашучае змаганьне КП(б)Б і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці з беларускім нацыянал-дэмакратызмам сарвала «нацыянальныя» з іх маскі і паказала сапраўдны твар інтэрвэнтаў—змагароў за капіталістычную рэстаўрацыю.

Гэтае-ж змаганьне выкрыла і тую атруту, якой «выхоўвалася» маладое пакаленьне праз нацдэмаўскі падручнік. І на гэтым вучастку фронту пачата было бязьлітаснае змаганьне з ідэолёгамі і арганізатарамі буржуазнай рэстаўрацыі і інтэрвэнцыі: Карацей кажучы, **нацдэмаўскія падручнікі былі атпраўлены ў катлы папяровых фабрык.**

Адноўленаму кіраўніцтву БДВ і НКА прышлося правесьці надзвычайна вялікую працу па стварэньні новага падручніка ўжо ў мінулым годзе, але адсутнасьць аўтарскіх-кадраў, слабасьць паліграфічнай базы і інш., паслужылі прычынай таго, што ў мінулым годзе падручнікамі школы ў патрэбнай меры ня былі забясьпечаны.

У гэтым годзе пры выкананьні пляну выданьня падручнікаў у першую чаргу стаяла задача знайсьці новыя аўтарскія кадры. Можна зараз сказаць, што гэта задача ў асноўным вырашана здавальняюча: з 108 аўтараў, якія прымалі ўдзел у пісаньні падручнікаў гэтага году, **85 аўтараў пісалі ўпяршыню і пераважна брыгадным спосабам.**

Гэткі, досыць значны прыліў сьвежых сіл, якія ўпяршыню ўзяліся за работу, вымагаў надавычайна вялікай дапамогі з боку Мэтадкому НКА і БДВ.

Мэтадком тут зрабіў досыць значную работу, але работа гэтая не дала свайго эфэкту ўжо таму, што **ані водзін аўтар ня меў у часе пісаньня падручніка праграм,** па якіх ён павінен быў-бы гэты падручнік складаць (праграмы ў друк **па II канцэнтру былі здадзены ў апошнюю дэкаду мая, а для I-га**—у першую дэкаду чэрвеня). Адсюль, калі МК не падагнаў праграм да падручнікаў (а не наадварот, як гэта трэба было-б), ніякай гарантыі ў тым, што падручнікі адпавядаюць праграмам, у нас няма, ня кажучы ўжо пра тое, што аўтары, ды і сам МК, каб чаго ня ўпусьціць, уціскалі ў падручнік усё, як відаць, на ўсякі выпадак і падручнікі, на прыкладзе мінулага году, разбухлі непамерна (20-25 аркушаў для II году навучаньня); у выніку гэтага **адна тона дэфіцытнай паперы загінула марна.**

Другая задача, што стала пры выданьні падручнікаў, гэта—уважлівая мэтадычная і палітычная рэдакцыі. З гэтай задачай ня зусім справіліся работнікі Мэтадкому. БДВ ня так даўно **выданы падручнік хэміі Бляхэра, тыражом 10 тыс. экз.** Перад намі рэцэнзія на гэтую кніжку т. Гімальфарба. Рэцэнзэнт лічыць гэтую кніжку шкоднай і патрабуе забароны яе ўжываньня ў школе. Патрэбна адзначыць, што Мэтадком яшчэ да апублікаваньня рэцэнзіі вынес пастанову аб забароне ўжываньня кніжкі ў школах. Гэта добра. Шкодныя кніжкі трэба безадкладна выкінуць, не дапусьціць да школы. Але мы пытаемся, дзе быў Мэтадком і яго ўважлівасьць, калі ён клаў візу на гэтую кніжку? Што за спэцыялісты мэтадкому, калі так можна сказаць, у ліку 4 асоб давалі ёй ацэнку? **Хто будзе адказваць за тое, што не адзін дзесятак тон паперы сапсаваны, што страты па выданьні правышаюць 10 тыс. рублёў, што школа застанецца без падручніка хэміі?** Хто, пытаем мы?

На гэта пытаньне павінна даць адказ пракуратура рэспублікі, як гэтага патрабавала рэдакцыя «Зьвязды» у прыпісцы да артыкулу т. Гімельфарба.

Мы зусім ня зьбіраемся здымаць віны за выданьне кніжак Лапідуса, Астравіцінпава і Бляхэра з БДВ. Але мы супроць таго, каб за такія рэчы адказвала толькі БДВ. Пара біць па канкрэтных вінаватых. І мы гэтага патрабуем.

У пастанове ЦК запісана **«Злучыць мэтадычны і палітычны кантроль над падручнікамі ў мэтадкоме НКА».**

Між тым, мэтадком парашыў пазбавіцца ад такой клапатлівай справы, як рэдагаваньне падручнікаў. Куды спакайней рэдагаваць цыркуляры. Ужо зараз, замест таго, каб дабіцца рашучага пералому ў справе адказнасьці кожнага супрацаўніка за яго працу, пішуцца ўсялякія «пражэкты».

Пару году пра агульны стан выданьня падручнікаў у гэтым годзе. На 1 ліпеня асноўная і неабходная маса падручнікаў здадзена ў друкарню; 21 назва для I—II канцэнтру вышла з друку.

Але пагроза зрыву навучальнага году ня мінула. Больш таго, яна з кожным днём **расьце, бо папяровая фабрыка «Гэрой працы» паперы ня дае нават тэй паперы, што вызначана нам у абрэз па нормах Дзяржпляну. Асноўнае абсталяваньне друкарні, што занята друкаваньнем падручнікаў, стаіць, і з кожным новым днём прарыў павялічваецца.** На вас, таварышы Дабрушане, падае надвялікая доля віны за тое, што школа можа застацца без падручнікаў. І ад вас чакае адказу шматтысячная армія школьнікаў. Чакае як мага хутчэй, бо яшчэ пару тыдняў і—будзе позна. Адгукнецеся, нарэшце, тонамі так патрэбнай зараз паперы. Мы чакаем гэтага адказу.

Як ужо была сказана, на працягу 31 году да 1 ліпеня надрукавана 21 назва ні 120.000 экз. падручнікаў. 75 проц. гэтых падручнікаў павінны пайсьці на вёску, і данесьці іх у школу павінна спажывецкая кааперацыя. Між тым, тэмпы забору гатовай прадукцыі БКС такія, што стварацца пагроза, што нават надрукаваныя падручнікі могуць да школы не дайсьці. Досыць таго, што на 1 ліпеня на базах БДВ **сабрапася падручнікаў на суму да 400 тыс. руб.,** а БКС аніяк ня мог дагаварыцца, каб іх разаслаць у школы.

Плянавае бюро забараніла БКС і БДВ рассылку падручнікаў без яго **паказаньня** колькасьці завозу адпаведна з лікам школ і вучняў у раёны. Некаторыя-ж раёны, замест таго, каб пакланіцца склаўшы дагаворы з раённымі спажывецкімі крамамі і даць на выкуп падручнікаў асыгнаваньні на бюджэце на гэту мэту сродкі, лічылі, што гэта яны пасьпеюць зрабіць у верасьні (!), забываючы, што толькі аднэй назвы падручнік тыражом у 100 тыс. складае за 30 4-х[illegible]довых скрышак на адзін сярэдні раён, яны забылі і тое, што восеньню загружаць транспарт тымі грузамі, якія можна перавезьці летам.

А гэта прывяло да таго, што БДВ заставалася на вострадэфіцытным таварам—падручніках амаль на 400.000 руб. а дзеля таго, што кантроль рублём, зусім слушна, распаўсюджваецца і на БДВ, апошняе прымушана было ці прадаць падручнікі неарганізаванаму пакупцу, ці з прычыны адсутнасьці сродкаў, абвясьціць сябе банкрутам і спыніць выдавецкую дзейнасьць. Трэба было і на гэты (каторы ўжо) раз, каб умяшаўся тав. Калнін, каб НКА даў каэфіцыэнт, а БКС пачаў хоць павольна забіраць падручнікі.

Пара ўжо думаць і пра наступны навучальны год. Каб яго свячасова забясьпечыць падручнікамі, неабходна:

На 1-е верасьня даць аўтарам праекты праграм і асноўныя ўстаноўкі па кожнай дысцыпліне, каб на працягу апошніх чатырох месяцаў падручнікі былі аўтарамі напісаны і адрэдагаваны, і з 1 га студзеня пайшлі ў друк. Інакш пры ўзросшых запатрабаваньнях слабая паліграфія зноў ня ўправіцца іх надрукаваць да пачатку навучальнага году. Яна зможа гэта зрабіць только тады, калі сэзон друкаваньня падручнікаў будзе ня меней, як 8-9 месяцаў.

Трэба зараз-жа ўстанавіць, якія з сёлетніх падручнікаў можна будзе дапусьціць да ўжываньня ў школах у наступным годзе, каб цяпер жа з іх зрабіць матрыцы і пасьля даць стэрэатыпнае выданьне, што дасьць магчымасьць скараціць выдаткі і час на надрукаваньне ня меней, як у тройчы.

Тыя, ад каго гэта залежыць, гэта павінна зараз-жа зрабіць.

„ПРАВДУ"

ў рабочыя, калгасныя і аднаасобныя бядняцка-серадняцкія масы

Калгасы БССР, прымайце выклік с.-г. арцелі „ПРАМЕНЬ КАМУНЫ"

АЖЫЦЬЦЯВІМ ПАСТАНОВУ ЦК КП(б)Б АБ РАСПАЎСЮДЖАНЬНІ „ПРАВДЫ"

ДА 1-га ЖНІЎНЯ—НЯ МЕНШ 70.000 ПАДПІСЧЫКАЎ

ДА УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ БССР З АДОЗВЫ С.-Г. АРЦЕЛІ „ПРАМЕНЬ КАМУНЫ"

Савецкая Беларусь пад выпрабаваным кіраўніцтвам КП(б)Б і яе ЦК, пры братэрскай дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу, шпаркімі тэмпамі ператвараецца ў саўгасна-калгасную індустрыяльную краіну, у рэспубліку сацыялістычных фабрык мяса і тэхнічных культур.

Наш калгас «Прамень камуны», Старобінскага раёну, які яднае 172 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, — адзін з тых, які пад кіраўніцтвам КП(б)Б дабіўся вялікіх перамог на фронце другой большавіцкай сяўбы.

Плян сяўбы намі перавыканан. Мы па-большавіцку падрыхтаваліся да ўборачнай кампаніі. Дзякуючы шырока разгорнутаму сацыялістычнаму спаборніцтву і ўдарніцтву, правільнай арганізацыі працы, мы датэрмінова закончылі поліва і сенаўборку.

Праз «Правду» мы знаёміліся з гэраічнай барацьбой рабочае клясы ібядняцка-серадняцкіх мас вёскі за выкананьне пяцігодкі за 4 гады. Між тым, ЦО «Правда» яшчэ мала пашырана сярод шырокіх мас вёскі.

Вось чаму мы горача вітаем пачатую кампанію за прасоўваньне «Правды» ў шырокія масы рабочых і калгасьнікаў.

Са свайго боку мы ўсе як адзін пісьменныя калгасьнікі падпісваемся на «Правду» ў колькасьці 150 экз. і абяцяем сябе ўдарнікамі «Правды» па прасоўваньні цэнтральнага органу партыі ў калгасныя масы. Бярэм шэфства над кальцовай поштай і абяцаем ёй аказаць рэальную дапамогу ў справе прасоўваньня «Правды» ў вёску і наглядаць за свячасовай дастаўкай ля падпісчыкам.

Мы зварачаемся да ўсіх калгасьнікаў БССР пасьледаваць нашаму прыкладу.

Таварышы калгасьнікі, выступайце в канкрэтнымі абавязацельствамі, уключайцеся ў паход за новыя мільёны чытачоў цэнтральнага органу «Праўда», аказвайце канкрэтную дапамогу паштоваму і газэтнаму апарату па прасоўваньні «Правды» ў вёску.

Па прыкладзе рабочых буйнейшых заводаў і фабрык, на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва шырока разгорнем масавую і растлумачальную работу па прасоўваньні «Правды» ў масы.

ПРАЗ ЦО—«ПРАВДУ» І «ЗЬВЯЗДУ» даем абяцаньне, што на аснове шырока разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, на аснове зьдзейснены, правільнай арганізацыі працы, кіруючыся пастановамі пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і апошнім указаньнем тав. СТАЛІНА, пад кіраўніцтвам КП(б)Б па-большавіцку выканаем плян уборкі і з посьпехам правядзем асеньнюю сяўбу.

Няхай жыве Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і яго орган — большавіцкая «Правда».

АГУЛЬНЫ СХОД КАЛГАСЬНІКАЎ «ПРАМЕНЬ КАМУНЫ», СТАРОБІНСКАГА РАЕНУ.

Заваяваць пералом

Прайшло 8 дзён пятнаццацідзеньніка штурму па прасоўваньні **«ПРАВДЫ»** ў масы. Значная частка прадпрыемстваў і арганізацый Менску па-большавіцку ўзяліся за выкананьне дырэктыў ЦК і гаркому. Побач з гэтым па радзе буйнейшых менскіх прадпрыемстваў амаль нічога ня зроблена для ліквідацыі прарыву ў распаўсюджаньні «Правды».

Партыйны калектыў **МБВ** чыг., які налічвае больш 450 членаў партыі пры камітэце ў 350 экз. на ліпень мае ўсяго **19** экзэмпляраў. Здавалася-б, што калектыў неадкладна мабілізуе партыйную арганізацыю на рэалізацыю пастановы гаркому і ЦК КП(б)Б. Між тым, да гэтага часу на калектыве МБВ чыг. нічога ня зроблена, фармальна вылучаны ўпаўнаважаныя, якія таксама нічога ня робяць, у выніку такой бязьдзейнасьці дырэктывы ЦК і гаркому пастаўлены пад пагрозу зрыву.

Ня лепшае становішча і ў **друкарні імя Сталіна.** На ліпень кантрольныя лічбы па друкарні выкананы на **25%,** партыйны калектыў даў абяцаньне і нават высунуў сустрэчны на прасоўваньні **«ПРАВДЫ»** сярод рабочых друкарні. Абяцаньні засталіся толькі абяцаньнямі, а практычна ніякай работы не праводзіцца.

На чырвонасьцяжнай фабрыцы «Кастрычнік», якая амаль увесь час была наперадзе на прасоўваньні «Правды» ў масы, за апошні час з-за бязьдзейнасьці таварышоў, якія кіруюць гэтай справай, тыраж «Правды» панізіўся. Партыйныя калектывы ня ўжываюць ніякіх мер у справе ліквідацыі прарыву па «Правде». Кантрольныя лічбы не даведзены да цэхаў, ячэйкі не абмеркавалі пытаньня прасоўваньня «Правды» сярод рабочых.

Да канца штурму засталіся лічаныя дні. Пры максымальнай увазе партыйных камітэтаў можна нагнаць прапушчанае. Гаркому КП(б)В трэба неадкладна прымусіць партыйныя камітэты выконваць сваю дырэктыву.

ПАСТАНОВА ЦК І МЕНСКАГА ГАРКОМУ ПАВІННА БЫЦЬ ВЫКАНАНА ПОЎНАСЬЦЮ І Ў ТЭРМІН.

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

У апошнія дні падпіска на «Правду» павялічваецца. За 21 і 22 завербавана 55 новых падпісчыкаў на «Правду» і кантрольныя лічбы выкананы на 80%.

ЧАВУСЫ.

Раённая партыйная арганізацыя разгарнула масава-растлумачальную работу па прасоўваньні «Правды» ў масы. За тры дні завербавана новых 180 падпісчыкаў на «Правду». Кантрольныя лічбы выкананы. Высунут сустрэчны плян.

БЯЛЫНІЧЫ

Раённа-партыйная арганізацыя ўключылася ў правядзеньне пятнаццацідзеньніка штурму па прасоўваньні «Правды» ў масы. Праводзяцца гутаркі на ўсіх парт'ячэйках, заслухана спэцыяльнае пытаньне аб штурме. За апошнія дні разьніца па раёне павялічылася на 10 экз.

ГОМЕЛЬ

Створан штаб штурму па прасоўваньні «Правды». Буйнейшыя прадпрыемствы заключылі сацдагавары на максымальны аклон падпіскай. Штодзенна на радыё перадаецца ход штурму.

БАБРУЙСК

Газэтнае бюро па-ранейшаму бязьдзейнічае. Замест прысылкі канкрэтнага пляну работы па штурме, замест паведамленьня першых вынікаў штурму газэтнае бюро абмяжоўваецца прысылкай бюракратычных тэлеграм наступнага зьместу: «Кантрольныя лічбы перавыканаем».

У Менску арганізуецца балотны інстытут

Сельгасакадэмія імя Леніна пастанавіла арганізаваць у Менску балотны інстытут, у задачы якога ўваходзіць паглыбленае вывучэньне глебы, балот і балотных культур.

Пастанова выклікана вялікім палітычна-гаспадарчым значэньнем вялізарных мэліярацыйных работ, якія будуць праводзіцца ў БССР, а таксама німэтазгоднасьцю распыленьня навукова-дасьледчай работы.

Акадэмія зьвярнулася ў СНК БССР з прапановай вылучыць матар'яльную базу балотнага інстытуту, даць памяшканьне і частку абсталяваньня.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б І МЕНГАРПРАФСАВЕТ скліканьць 25 ЛІПЕНЯ г. г. **6 гадзін вечара, у памяшканьні летняга тэатру саду «ПРАФІНТЭРН» ГАРАДЗКУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ.**

Парадак дня:

1. Вынікі выкананьня прамфінпляну за 1-е паўгодзьдзе і задачы выкананьня прамфінпляну 2-га паўгодзьдзя (дакладчык тав. ГРЫСЕВІЧ).

2. Аб перабудове спажыўкааперацыі і задачах рабочага забясьпячэньня (дакладчык — тав. ХАСКІН).

Модус прадстаўніцтва на канфэрэнцыю: 1 дэлегат ад 5 рабочых-ударнікаў.

Прапануецца сакратарам парткалектыву і ячэек КП(б)Б і францыям ФЗМК зараз-жа разгарнуць падрыхтоўчую работу да канфэрэнцыі і выбраць адпаведную колькасьць дэлегатаў.

Мандаты на канфэрэнцыю атрымаць у Гаркоме КП(б) (пакой № 19) па 25 ліпеня з 9-ці гадз. раніцы да 4-х гадз. дня.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б, МЕНГАРПРАФСАВЕТ.

Паведамленьні

— Менская Гар. КК КП(б)Б выклікае на парт. тройку 25-га ліпеня г. г. у 6 гадзін увеч. (Энгельса, 28) наступных т. т.: Сосьнер (Цэнтр. Калгасн. школа), Вальфсон М. М. (ф-ка «Кастрычнік»), Біргер (ВДК), Хорашаў і Юхневіч (завод «Беларусь»), Фельдман. і Фітэрштэйн (шчапінная ф-ка), Гальперовіч і Рубенчык (завод «Бальшавік»), Шкрабатоўскі (Белсельбуд), Вадзеев і Гравінчанкаў (5 узвод аховы МВВ), Каровін (Галоўдортранс), Сьвятлоў (ВКС), Гайдук (МРВ), Рымашэўскі («Полымя Рэвалюцыі»), Соскін («Бальшавік»), Ратынец (шчапінная ф-ка), Барабы В. Х. (Рабфак), Мухіна (Мэдтэхнікум), Пракаповіч (Менмясакомбінат), Ўнгер для ўдзелу ў разглядзе іх спраў. Таксама павінны зьявіцца сакратары ячэек, дзе гэтыя таварышы лічацца на вучоце.

**— Сьпіс дакладчыкаў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б